

**Дзе жывуць народныя песні?**

СТАР. 3



**Сакрэты патомнага каваля.**

СТАР. 6



**Старэйшы брат... на гадзіну**

СТАР. 8

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

29 жніўня 2014 г. ПЯТНІЦА № 163 (27773) Кошт 1800 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## СКЛАДАНЫ МЕХАНІЗМ ПАВІНЕН ПРАЦАВАЦЬ ДАСКАНАЛА

### Чаму сістэма спажывецкай кааперацыі здае свае пазіцыі?

**Стан спраў у спажыўкааперацыі абмяркоўваецца на пасяджэннях калегіі КДК кожныя 4-5 гадоў. Важнасць гэтага сегмента рэальнага сектара эканомікі рэспублікі цяжка пераацаніць: сістэма спажывецкай кааперацыі абслугоўвае амаль 3,5 млн чалавек, у асноўным сельскіх жыхароў. У ёй працуюць больш за 70 тысяч чалавек.**

«Кіраўнік дзяржавы, урад аказваюць айчыннай спажыўкааперацыі сістэмную падтрымку, каб дапамагчы ва ўмовах бурнага развіцця рынкавых адносін не страціць твар, утрымаць пазіцыі на ўнутраным рынку, — заявіў на пасяджэнні калегіі Камітэта дзяржаўнага кантролю выканаўца абавязкаў яго старшыні Леанід Анфімаў. — Аднак даводзіцца канстатаваць, што сістэме спажывецкай кааперацыі ўсё складаней канкурыраваць з арганізацыямі прыватнай формы ўласнасці».

Асноўны від дзейнасці спажыўкааперацыі — рознічны гандаль (65% агульнай выручкі ад рэалізацыі тавараў, работ, паслуг). Тут занята 55% работнікаў. Адзіная сетка да апошняга часу займала манапольнае становішча ў райцэнтрах і сельскай мясцовасці. «Аднак яна не змагла супрацьстаяць гандлёвым сеткам», — падкрэсліў выканаўца абавязкаў старшыні КДК. Удзельная вага спажывецкай кааперацыі ў рознічным тавараабароце гандлю пастаянна зніжаецца (у 2009 годзе — 12,8%, у 2013-м — 9,8%).

Па словах Леаніда Анфімава, не атрымліваецца вырашыць праблему парушэнняў у рознічнай гандлёвай сетцы спажыўкааперацыі. Падчас апошняй праверкі ў 31 арганізацыі спажыўкааперацыі і ў 213 структурных падраздзяленнях парушэнні выяўлены паўсюдна. У 75% выпадкаў гэта парушэнне правілаў гандлю, у 32% — невыкананне санітарных правілаў і нормаў, у 26% — рэалізацыя або прапанова да рэалізацыі тавараў са скончаным тэрмінам прыдатнасці. «Маючы станоўчы вопыт абслугоўвання наведвальнікаў на аб'ектах грамадскага харчавання, «Белкаапсаюз» недастаткова актыўна ўдзельнічае ў фарміраванні сеткі аб'ектаў прыдарожнага сэрвісу», — лічыць Леанід Анфімаў.

Пакуль не абнадзейвае і стварэнне брэндавай рознічнай гандлёвай сеткі спажыўкааперацыі «Родны кут». На 1 мая ў краіне пад гэтым брэндам функцыянавалі 2049 гандлёвых аб'ектаў (22% крам «Белкаапсаюза»). Аднак паміж магазінамі гандлёвай сеткі «Родны Кут» і іншымі нябрэндавымі магазінамі спажыўкааперацыі ніякай розніцы няма. Рэфармаванне сістэмы аптовага гандлю спажыўкааперацыі ідзе павольна. Ужо на першым этапе рэформаў ёсць шмат недахопаў. Спажыўкааперацыя саступае сучасным лагістычным кампаніям і гандлёвым сеткам у цэнах на ідэнтычныя тавары і хуткасці руху тавараў.

Нарыхтоўчы абарот у сістэме спажыўкааперацыі за 2013 год упершыню за апошнія гады вызначыўся небывала нізкім тэмпам росту закупак у насельніцтва сельскагаспадарчай і дзікарослай прадукцыі. Летась не выкананы заданні па 6 пазіцыях з 12: бульбе, садовых суніцах, семкавых пладах, костачкавых пладах, чарніцах, грыбах. «Нарыхтоўка клубніц, чарніц, грыбоў фактычна аддадзена прыватнікам», — лічыць Леанід Анфімаў.



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Патрабуе ўвагі і самая прыбытковая галіна спажыўкааперацыі — зверагадоўля, эфектыўнасць якой у 2013 годзе таксама пачала зніжацца (летась зверагаспадаркі атрымалі чыстага прыбытку толькі 33% да ўзроўню 2012 года). «Белкаапсаюз» не здольны аператыўна і эфектыўна рэагаваць на зменлівую сусветную кан'юнктуру пушнога рынку. Выпуск высакаякаснай гатовай прадукцыі ў адзіным на ўсю спажыўкааперацыю падраздзяленні відавочна недастатковы.

Тэмп росту аб'ёму экспарту тавараў «Белкаапсаюза» склаў у мінулым годзе 103,4% пры плане 117,2%. Сёлета ў студзені—чэрвені гэты паказчык наогул быў 94% пры прагнозе 119-121%. Фінансавае становішча «Белкаапсаюза» пагаршаецца. Асноўная прычына зніжэння паказчыкаў у 2013 годзе ў тым, што тэмпы росту выдаткаў перавысілі тэмпы росту выручкі ад рэалізацыі. Па выніках працы за 2013-ы чысты прыбытак знізіўся ў 2,3 раза.

«Камітэт дзяржкантролю заклапочаны такім становішчам спраў, — сказаў Леанід Анфімаў. — Абмеркаванне на пасяджэнні калегіі, хутчэй, накіравана на ўказанне вузкіх месцаў гаспадарчай дзейнасці «Белкаапсаюза» для таго, каб пазбавіцца ад іх, чым на аднабаковую крытыку. КДК імкнецца дапамагчы ва ўдасканаленні і развіцці сістэмы спажывецкай кааперацыі як адзінага зладжанага механізму».



Фота БЕЛТА.





## ПА «ЗЕБРЫ» — У ШКОЛУ!

*Акцыю ў рамках рэспубліканскага комплекснага мерапрыемства «Увага — дзеці!» гэтымі днямі праводзяць супрацоўнікі ДАІ УУС Віцебскага аблвыканкама. Побач з 10-цю школамі абласнога цэнтра былі нанесены «зебры», праведзена прафілактычная праца з дзецьмі і кіроўцамі.*

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый МАКАРАЎ, начальнік стратэгічнага планавання «Раскосмаса»:**

***«У Беларусі такога паняцця, як ракетна-касмічная прамысловасць, няма фармальна: у краіне дастаткова прадпрыемстваў і спецыялістаў, каб гаварыць пра беларускую ракетна-касмічную галіну прамысловасці. Існуе дастаткова арганізацый, якія працуюць у галіне космасу. У рамках праграм Саюзнай дзяржавы створаны касцяк, сфарміравана кааперацыя, якую ўмоўна можна назваць ракетна-касмічнай прамысловасцю Беларусі. Распрацоўваюцца канцэпцыі пяці праграм, звязаных з сумеснымі работамі па дыстанцыйным зандзіраванні Зямлі, абмене інфармацыяй і інтэграцыі беларускага касмічнага патэнцыялу і інфраструктуры ў расійскія касмічныя праекты. Ёсць таксама цікавыя прапановы ў галіне адукацыйных праграм».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 29.08.2014 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 10420,00 | ▲ |
| Еўра | 13760,00 | ▼ |
| Рас. руб. | 287,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 777,61 | ▲ |

■ Арэнда жылля

## ХОПІЦЬ УСІМ

### Сёлета ў студэнтаў існуе дастатковы выбар нават сярод бюджэтных кватэр

**Нагадаю, што да сярэдзіны ліпеня попыт на арэнднае жыллё ў сталіцы быў мінімальны. І гэта не толькі сезонная тэндэнцыя. Справа ў тым, што з пачатку года ў сферы куплі-продажы кватэр на рынку жыллёвай нерухомасці назіраецца сапраўдны «мёртвы» сезон. Гэтая акалічнасць прымусіла ўласнікаў свабоднага жылля «выкінуць» свае памяшканні на рынак арэнды. Таму на працягу апошніх пяці месяцаў у Мінску назіралася плаўнае зніжэнне цэннікаў прыватнай арэнды. Менавіта на такім «сытым» фоне рынак дачакаўся сярэдзіны жніўня, калі ў буйных гарадах пачынаецца студэнцкі ажыятаж. Пра сённяшнюю сітуацыю на сталічным рынку арэнды і прагнозы на бліжэйшую перспектыву карэспандэнту «Звязды» паведаміла галоўны спецыяліст па аперацыях з нерухомасцю Цэнтра гандлю нерухомасцю «ПАКАДАН» Алена АГРЫЗКА.**

#### СТАЎКІ КРЫХУ ПАВЯЛІЧЫЛІСЯ

— Адразу адзначу, што самая вялікая колькасць прапановы і, адпаведна, мінімальныя цэны прысутнічалі на мінскім рынку ў чэрвені-ліпені. Тады ў рэгістры прапановы існавала дастаткова сярэдніх па якасці аднапакаёвых кватэр з цэннікам ад 300 да 370 долараў. Сёння ўпэўнены попыт на здымнае жыллё падкарэктаваў цэнавы ўзровень прыватнай арэнды. Амаль усе кліенты цяпер заказваюць невялікія па плошчы кватэры па мінімальным кошце, які складае 350-370 долараў. Толькі адно агенцтва прымае ад будучых кватарантаў каля 12-15 заявак за дзень. Пераважна гэта студэнты, маладыя спецыялісты, што скончылі ВНУ, а таксама сямейныя пары.

Зразумела, што за два апошнія тыдні павышанага попыту стандартнае і недарагое жыллё было «вымыта» са сталічнага рынку. Аднак гэта не праблема, бо спіс прапановы таксама штодзённа абнаўляецца. Часам магчыма адшукаць нешта нават і танней.

СТАР. 2



■ Надвор'е

## ДАЖДЖЫ І ТРОХІ ХАЛАДНАВАТА

### Сіноптыкі прагназуюць, што пацяплее толькі з аўторка

**У бліжэйшыя дні надвор'е на тэрыторыі Беларусі будзе фарміравацца пад уплывам вільготнага і халоднага паветра, якое перамяшчаецца да нас з боку Балтыйскага мора, паведаміла рэдакцыі спецыяліст Рэспубліканскага гідраметцэнтра Мінпрыроды Вольга ФЯДОТАВА.**

У суботу непрацяглыя дажджы чакаюцца ўжо толькі месцамі па краіне. Раніцай і ўначы ў нізінах магчымы туман. Уначы плюс 5-11 градусаў, удзень — 15-22 цяпла. Чарговы франтальны раздзел з боку Польшчы прынясе да нас у нядзелю невялікія дажджы. Месцамі навальніцы, а ўначы і раніцай — туман. У ноч на нядзелю пахаладае да плюс 4-10 градусаў, аднак па паўднёвым захадзе Брэсцкай вобласці будзе 11-13 цяпла. Не зусім камфортнае надвор'е чакаецца і ў апошні дзень лета. Тэмпературны фон тады знізіцца да плюс 14-20 градусаў, на поўдні — да 22 цяпла.

У ноч на панядзелак месцамі, а ўдзень паўсюдна пройдуць кароткачасовыя дажджы, часам навальніцы. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 4 градусаў па паўночным усходзе да 14 цяпла — па паўднёвым захадзе краіны. Удзень 1 верасня будзе плюс 14-20 градусаў. У сераду і аўторак тэрыторыя нашай краіны трапіць пад уплыў скандынаўскага антыцыклону — і стане больш сонечна. Толькі месцамі пройдуць кароткачасовыя дажджы. Пацяплее. Уначы чакаецца плюс 6-15 градусаў, удзень паветра прагрэецца да 16-22 цяпла, а па ўсходзе краіны месцамі будзе да плюс 23-25 градусаў.

**Сяргей КУРКАЧ.**

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### Польшча заявіла пра гатоўнасць НАТА прадаць зброю Украіне



Кіраўнік Бюро нацыянальнай бяспекі Польшчы Станіслаў Кажэй заявіў, што шэраг краін НАТА гатовы прадаць Украіне зброю. Па словах Кажэя, вырашэнне гэтага пытання будзе залежаць ад таго, ці папросіць прэзідэнт Украіны Пётр Парашэнка аб пастаўках зброі на бліжэйшым саміце Паўночнаатлантычнага альянсу, які адбудзецца ў пачатку верасня ў Вялікабрытаніі. «Дзяржавы — члены НАТА не павінны атрымліваць згоду альянсу, таму што справа зброі, яе продажу адносіцца да нацыянальнай кампетэнцыі... Вядома, на саміце НАТА можа быць пэўная каардынацыя, каб гэтыя дзеянні выглядалі як агульныя, а не індывідуальныя», — заявіў кіраўнік бюро. Раней у прадастаўленні ваеннай дапамогі Украіне адмовілі Фінляндыя, Германія і ЗША. Амерыканскі бок, у той жа час, аказаў украінскай арміі гуманітарную дапамогу.

### У Вільнюсе вывесілі перавернуты сцяг



На Ратушнай плошчы Вільнюса вывесілі перавернуты літоўскі сцяг. Пра гэта паведамляе DELFI. Партал адзначае, што чытачы абураны такой безадказнасцю. Трыкалор вісеў такім чынам увечары 26 жніўня і раніцай 27-га. Відавочцы паведамілі пра гэта ў паліцыю, аднак яе супрацоўнікі нічога рабіць не сталі. Прадстаўнік галоўнага камісарыята паліцыі Паўлюс Радвілавічус пацвердзіў, што інфармацыя аб перавернутым трыкалоры паступіла ў праваахоўныя органы. Паліцыя, з яго слоў, зараз высвятляе, хто адказвае за ўзняцце сцяга, пасля чаго запатрабуе ад адказных асоб выправіць становішча, паколькі перавешванне сцягоў — не ў яе кампетэнцыі.

### Мухамед — найбольш папулярнае імя ў Осла

Самым папулярным мужчынскім іменем у Осла стала Мухамед. Гэта адбылося ўпершыню ў гісторыі нарвежскай сталіцы, піша газета The Local. Паводле падлікаў экспертаў, увогуле гэтае імя носяць 4,8 тыс. маладых людзей. На другім месцы імя Ян (амаль 4,7 тыс.), трэцяе займае Пер (4,1 тыс. чалавек). Як адзначае выданне, чатыры гады запар Мухамед было самым папулярным дзіцячым іменем у Осла. Аднак лідарам сярод усіх мужчынскіх імёнаў у нарвежскай сталіцы яно стала толькі цяпер. За апошнія некалькі гадоў імя Мухамед таксама часцей за іншыя гучыць у радзільных дамах Англіі і Уэльса і ў такіх гарадах, як Амстэрдам, Гаага, Ратэрдам, Утрэхт, Брусель.

ISSN 1990 - 763X

14163

9 771990 763008

### ПАДРАБЯЗНАСЦІ

#### Звычка ездзіць на працу на машыне правакуе атлусценне

Людзі могуць скінуць 3 кілаграмы, калі перасядуць на веласіпеды, грамадскі транспарт ці будуць дабірацца да працы пешшу. Такую выснову навукоўцы зрабілі пасля таго, як ацанілі індэкс масы цела больш за 15000 чалавек, піша The Daily Mail. Сярэдні паказчык у мужчын быў 28, а ў жанчын — 27. Між тым паказчык ад 25 да 30 сведчыць аб наяўнасці лішняй вагі, адзначаюць супрацоўнікі ўніверсітэцкага каледжа Лондана і Лонданскай школы гігіены. Індэкс масы цела быў ніжэй у людзей, якія не карысталіся машынамі. Для мужчын паказчык апускаўся прыкладна на 1 пункт (эквівалентна 3 кілаграмам), а для жанчын — на 0,7 пункта (2,5 кілаграма). Аказалася, што выкарыстанне грамадскага транспарту можна было параўнаць па эфекце з перамяшчэннем на веласіпедзе або пешшу.

### КОРАТКА

Амаль 30 дадатковых пляцовак для гандлю кветкамі адкрыецца ва ўсіх раёнах Мінска з 29 жніўня, каб максімальна задаволіць пакупніцкі попыт напярэдадні святочных лінеек, прысвечаных пачатку навучальнага года. 5 кветкавых палян з'явяцца ў пераходах станцый метрапалітэна, 12 — каля пешаходных пераходаў у раёне чыгуначнага вакзала, астатнія — у мікрараёнах горада.

**З кастрычніка 2014 года кваліфікацыйны экзамен для кандыдатаў у адвакаты будзе ўключаць у сябе электроннае тэсціраванне. Тэст кожны раз для асобнага стажора будзе новы. Як чакаецца, пераход з паперы на камп'ютар дасць магчымасць праводзіць экзамен хутчэй і выключыць суб'ектыўны фактар пры ацэнцы якасці ведаў стажораў.**

20 і 21 верасня ў раёне Палаца спорту ў Мінску ўпершыню пройдзе спецыялізаваны кірмаш стокавых нехарчовых тавараў. На адной гандлёвай пляцоўцы сваю прадукцыю прадставяць каля 30 буйных айчынных прадпрыемстваў — вытворцаў швейных, трыкатажных, галантарэйных тавараў і абутку.

■ Думайце самі

## ШКОЛЬНЫ АБЕД ЦІ БУТЭРБРОД?

**На думку дыеталагаў, сучасны школьнік павінен есці не менш як чатыры разы на дзень. Пры гэтым перапынкі паміж прыёмамі ежы не могуць перавышаць 4 гадзіны. А што мы маем насамрэч?**

— На жаль, некаторыя бацькі разважаюць прыкладна так: маўляў, дзіця пакормяць у школе, таму адной праблемай менш, і дома можна «расслабіцца», — падзялілася сваімі назіраннямі **загадчык аддзялення гігіены дзяцей і падлеткаў Рэспубліканскага цэнтра гігіены і эпідэміялогіі Ала МАЛАХАВА.** — Хачу папярэдзіць, што яны глыбока памыляюцца. Гарачы сняданак, які атрымліваюць у школе дзеці, задавальняе іх сутачную патрэбу ў калорыях толькі на 15-20 працэнтаў. Таму дамашні сняданак з'яўляецца найважнейшым складнікам рацыянальнага харчавання школьнікаў. Гэты пункт ні ў якім разе нельга выключаць. Раніцай, перад заняткамі, для папаўнення будучых энергавыдаткаў дзіця павінна атрымаць не толькі каву ці гарбату, але і абавязкова гарачую кашу, тварожную або яечную страву, бутэрброд.

СТАР. 2



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

■ Знешнепалітычны вектар

## МІНСК — ПЛЯЦОЎКА МІРУ

**Чарговая сустрэча кантактнай групы Украіна—Расія—АБСЕ пройдзе ў самы бліжэйшы час. Гэта пацвердзіў на брыфінгу Дзмітрый МІРОНЧЫК, прэс-сакратар Міністэрства замежных спраў Беларусі. У той жа час канкрэтызаваць тэрміны можна будзе па меры прыбліжэння гэтай падзеі.**

Нагадаем, на мінулым саміце ў Мінску кіраўнікі дзяржаў дамовіліся аб пасяджэнні кантактнай групы па Украіне ў сталіцы нашай краіны. Адказваючы на пытанні журналістаў, якой Беларусь бачыць сваю ролю ва ўрэгуляванні сітуацыі ў суседняй краіне, Дзмітрый Міронччык заўважыў, што наша краіна прапанавала Мінск у якасці пляцоўкі для перамоў па гэтым пытанні.

## СТАСУНКІ БЕЛАРУСІ З ЕС АБМЯРКУЮЦЬ У ПОЛЬШЧЫ

**Цяпер праходзіць рабочы візіт Уладзіміра Макея, міністра замежных спраў Беларусі, у Польшчу. Запланаваны сустрэчы з міністрам замежных спраў гэтай краіны Радаславам Сікорскім, міністрам эканомікі Яцэкам Пехацінскім, а таксама з прадстаўнікамі польскіх дзелавых колаў.**

Падчас перамоў будуць абмеркаваны пытанні двухбаковага беларуска-польскага супрацоўніцтва, узаемадзеяння Беларусі з Еўрапейскім саюзам, актуальная сітуацыя ў рэгіёне і іншыя тэмы, якія ўяўляюць узаемную цікавасць. Дзмітрый Міронччык таксама паведаміў, што беларуска-польскія стасункі ахопліваюць «шырокі спектр пытанняў узаемадзеяння ў эканамічнай і палітычных сферах». Дзяржавы сумесна вырашаюць пытанні, якія знаходзяцца ў зоне агульнага інтарэсу асноўных інтэграцыйных структур еўрапейскага кантынента: Еўрапейскага саюза і Адзінай эканамічнай прасторы.

## ЦІ МОЖНА ЧАКАЦЬ ІНВЕСТЫЦЫЙ З КУВЕЙТА?

**1 верасня ў Мінску адбудзецца другое пасяджэнне сумеснай беларуска-кувейцкай камісіі па эканамічным, гандлёвым і тэхнічным супрацоўніцтве. Старшынёй беларускай часткі камісіі з'яўляецца намеснік міністра замежных спраў Беларусі Валянцін Рыбакоў, старшынёй кувейцкай часткі — намеснік міністра фінансаў Дзяржавы Кувейт Халіфа Мусаід Хамада.**

— У цэнтры ўвагі будуць пытанні беларуска-кувейцкага інвестыцыйнага супрацоўніцтва, — удакладніў Дзмітрый Міронччык. — Будуць таксама абмяркоўвацца магчымасці актывізацыі гандлёвых кантактаў па лініі гандлёва-прамысловых палат абедзвюх краін. На разгляд кувейцкага боку плануецца прадставіць шэраг інвестыцыйных праектаў Беларусі.

Першае пасяджэнне беларуска-кувейцкай камісіі прайшло ў 2009 годзе. Важным складнікам эканамічных адносін дзвюх краін з'яўляецца супрацоўніцтва Беларусі з Кувейцкім фондам арабскага эканамічнага развіцця, якое пачалося ў 1992 годзе.

**Надзея ЮШКЕВІЧ**

■

# ШКОЛЬНЫ АБЕД ЦІ БУТЭРБРОД?

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

### ВЫКЛЮЧЭННЕ, А НЕ СІСТЭМА

Гарантаваны бясплатны гарачы абед атрымліваюць у школах толькі пэўныя катэгорыі дзяцей: са шматдзетных, малазабяспечаных сем'яў, дзеці, якія пражываюць на забруджаных радыенуклідамі тэрыторыях, вучні сельскіх школ і некаторыя іншыя. А ўсім астатнім даводзіцца самастойна клапаціцца пра абеды.

**Чыпсаў у школьных буфетах быць не павінна. А вось шакалад не забараняецца, але перавага павінна аддавацца дробнай яго расфасоўцы.**

«Ссабойка», папярэджвае Ала Малахава, таксама не варыянт. Яе можна разглядаць толькі як дапаўненне да паўнавартаснага абеду. Можна даць дзіцяці з сабой, напрыклад, бутэрброд з сырам ці з сыравяленай (толькі не з варанай!) каўбасой, пячэнне, сок у тэтрапакеце ці садавіну. Галоўнае правіла: прадукты, якія дзіця бярэ з сабой у школу для перакусу, не павінны хутка псавацца. Напрыклад, той жа ёгурт не можа захоўвацца без холаду. І, безумоўна, трэба паклапаціцца пра тое, каб «ссабойка» не ляжала побач з падручнікамі. І ўсё ж такі **замена гарачага харчавання можа быць толькі выключэннем з правіла, а не сістэмай**.

— Безумоўна, калі дзіця катэгарычна адмаўляецца харчавацца ў школе, то грошы не варта выкідваць на вецер. Але ў такім выпадку адміністрацыя павінна прасачыць, ці харчуецца дзіця «ссабойкамі» або набывае штосьці ў буфеце, паколькі школа таксама нясе адказнасць за ахову здароўя дзяцей у сценах установы адукацыі. Калі ёсць прэтэнзіі да школьнага харчавання, то іх трэба вырашаць праз адміністрацыю школы, — падкрэслівае спецыяліст. — Трэба памятаць, што школьнік малодшага ўзросту не здольны пры самастойным выбары страў аддаваць перавагу карысным для здароўя прадуктам, таму лепш здаць грошы на харчаванне класнаму кіраўніку. Толькі ў гэтым выпадку бацькі могуць быць упэўнены, што дзіця атрымала паўнавартасны абед, а не набыла на гэтыя грошы ласункі. Перавага школьных абедаў — гэта іх дыетычны характар: адсутнасць камбітлушчаў, вырабаў, прыгатаваных у фрыцюры, вострых прыпраў, воцату і прадуктаў з яго выкарыстаннем, а таксама тлустых гатункаў мяса. У харчаванні школьнікаў выкарыстоўваюцца толькі ашчадныя метады апрацоўкі прадуктаў — тушэнне, варэнне, прыгатаванне на пары. У сваю чаргу, забаронена выкарыстанне некарысных для здароўя закусачных і рыбных кансерваў.

**БУДЗЬ У КУРСЕ!**

Дзеці, у рацыёне якіх назіраецца дэфіцыт жывёльных тлушчаў, маюць праблемы з імуннай сістэмай, дрэнна пераносяць холад і часта хварэюць.

### ПРЫКЛАД ДЛЯ ДЗІЦЯЦІ

Загадчык лабараторыі праблем здароўя дзяцей і падлеткаў РНПЦ «Маці і дзіця» Маргарыта ДЗЕВЯЛТОЎСКАЯ падкрэслівае, што за апошнія дзесяць гадоў колькасць падлеткаў з залішняй вагой цела і атлусценнем павялічылася ўдвая, а колькасць дзяцей з цукровым дыябетам другога тыпу — у 1,5 раза:

— Прычына такога становішча спраў у незбалансаваным — як па складзе, так і па каларыйнасці — харчаванні. Як трэба харчавацца, дзіця бачыць у сваёй сям'і: харчовыя звычкі фарміруюцца ва ўзросце ад 6 да 12 гадоў. І тут мае значэнне ўсё: і псіхалагічная атмасфера, калі дзіця садзіцца за стол разам з бацькамі, і асартымент прадуктаў і страў, якія яму прапануюцца, і сервіроўка стала. Вельмі важна, каб і дзіця прыцягвалася да гатавання ежы і сервіроўкі стала, каб яно ўмела самастойна выбіраць у магазіне карысныя прадукты. Адным словам, у дзяцей у сям'і павінен быць прыклад здаровага харчавання.

### НІ ЧЫПСАЎ, НІ ГАЗІРОЎКІ

— На маю думку, у адрозненне ад малодшых школьнікаў, старшакласнікам лепш прадаставіць магчымасць выбару, таму што «абавязалаўка» толькі выкліча ў іх пратэст. Яны могуць браць у школе разукамплектаваныя абеды або заказваць асобныя стравы, — кажа Ала Малахава. — Дадаткова можна скарыстацца і школьным буфетам, за асартыментам якога таксама сочаць санітарныя ўрачы.

Упершыню асартыментны пералік школьных буфетаў быў уведзены ў Беларусі ў 2004 годзе, паколькі на той момант «буфеты пераўтварыліся ў сметніцу, дзе рэалізоўваліся самыя шкодныя, але вельмі любімыя дзецьмі прадукты». І з таго часу пералік пастаянна пераглядаецца, паколькі прадпрыемствы гандлю пастаянна шукаюць пралазы. Напрыклад, пры забароне на продаж каляровых газіраваных напояў тут жа пераарыентаваліся і прадавалі праз буфеты нефарбаваныя салодкія газіраваныя напоі. Цяпер пад забаронай знаходзяцца і першыя, і другія, і ўвогуле напіткі прамысловага паходжання, а прадаваць у буфетах можна толькі напіткі ўласнага прыгатавання.

Апошні раз патрабаванні да асартыменту буфетаў былі перагледжаны гэтым летам.

— Нам давялося абмежаваць прысутнасць у буфеце мучных вырабаў, якімі асабліва захапляюцца нашы дзеці. Калі школьнікаў не абмяжоўваць, то яны штодня будуць харчавацца толькі смажнямі, піцай і сасіскамі ў цесце, — патлумачыла Ала Малахава. — Піцу, смажанкі і сасіскі ў цесце дазваляецца прадаваць у буфетах цяпер не часцей, чым два разы на тыдзень. Да таго ж з новага навучальнага года ўсе школьныя буфеты павінны мець умовы для падагрэву кулінарных вырабаў. У якасці агульнаўмацавальнага прадукту ў асартымент буфетаў уведзены гематаген, але і ён можа з'яўляцца ў буфеце не часцей чым два разы за вучэбны тыдзень.

**ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»:**

Па інфармацыі Міністэрства адукацыі, у 2013/2014 навучальным годзе ахоп па краіне навучэнцаў гарачым харчаваннем перавысіў 90 працэнтаў. Для яго арганізацыі выкарыстоўваліся такія формы абслугоўвання, як папярэдні заказ страў па меню заўтрашняга дня (1930 устаноў, або 61% ад агульнай колькасці), па прынцыпе шведскага стала (526 устаноў, або 16,6% ). У 514 установах агульнай сярэдняй адукацыі (16,2%) працавалі школьныя буфеты і ў 155 (5%) — школьныя бары.

Для мадэрнізацыі працэсу арганізацыі харчавання ў дашкольных установах укараняюцца камп'ютарныя праграмы «Харчаванне» для складання штодзённага меню, меню-патрабавання і аналізу выканання натуральных нормаў.

Прыкладны пералік асартыментнай прадукцыі, дазволенай да рэалізацыі ў школьных буфетах, уключае свежую садавіну і гародніну, салаты са свежай гародніны са свежай зелянінай, салаты з морапрадуктаў, тварожныя вырабы (сыркі, пудынгі) у прамысловай парцыённай упакоўцы, сыры, сухія сняданкі кшталту мюслі ў выглядзе батончыкаў. З кандытарскіх вырабаў да продажу дапускаюцца мармелад, зефір, вафлі; з ласункаў — жэле, арэхі, сухафрукты, казінакі; з напіткаў — сокі і нектары, напіткі з журавін, шыпшыны і іншыя карысныя вітамінізаваныя напоі. Зразумела, што чыпсаў у школьных буфетах быць не павінна. А вось шакалад не забараняецца, але перавага павінна аддавацца дробнай яго расфасоўцы.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

# ХОПІЦЬ УСІМ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Напрыклад, за мінулы тыдзень агенцтва «ПАКАДАН» засяліла тры не новыя кватэры без мэблі за 320 долараў. У гэтым выпадку кліенты агенцтва чакалі выканання свайго заказу на працягу двух тыдняў. А вось больш якасныя (а таму і даражэйшыя) кватэры цяпер і шукаць не трэба. У агенцтвах існуе адразу некалькі дзясяткаў варыянтаў кватэр з сучаснай мэбляй і недалёка ад метро з цэннікам ад 380 да 450 долараў.

Сур'ёзна павялічыўся за апошні месяц цэннік на бюджэтныя стандартныя двухпакаёвыя кватэры. Мінімальная стаўка арэнды двухпакаёвак сёння складае 450 долараў. Па 400 долараў, як было раней, сёння прапаноў увогуле няма. Зараз нават «слабенькія хрушчоўкі» з сумежнымі пакойчыкамі ці пустыя кватэры ў новабудоўлях прапануюцца не танней чым за 430 долараў. Больш прывабныя двухпакаёўкі побач з метро гаспадары спрабуюць здаваць ужо за 500-600 долараў.

Не вельмі адрозніваецца мінімальны кошт арэнды і на бюджэтнае шматпакаёвае жыллё. Стартавы кошт трохпакаёвых кватэр цяпер складае 450-500 долараў. Попыт на падобнае жыллё за апошні месяц амаль не змяніўся, бо першакурснікі звычайна здымаюць маленькія кватэры, а студэнты са стажам пачынаюць займацца кампаньёнствам не раней чым у верасні-кастрычніку. Сапраўды якасная трохпакаёвая кватэра ў спальным раёне прапануецца кліентам за 500—700 долараў.

### ПАДАРАЖЭЛІ І АСОБНЫЯ ПАКОІ

Сёлета ўстойлівым попытам пачалі карыстацца асобныя пакоі ў звычайных кватэрах. Здымаюць такое жыллё тыя студэнты, у якіх не хапае грошай для арэнды нават таннай кватэры. Кошт такога жылля складае каля 130 долараў, калі кліент адзін здымае пакой, а з двух кватарантаў бяруць да 200-250 долараў. Па падобным максімальным цэнніку прапануюцца пакоі ў цэнтры горада. Нагадаю, што тры тыдні таму цэннік на пакоі быў у межах 100-110 долараў, а месцамі (напрыклад, у Шабанах) — нават і ніжэй.

Асобныя эксперты прагназуюць, што пакоі ў арэнду ў першыя дні верасня могуць падаражэць нават да 150 долараў. Праўда, падобнае магчымае падаражанне працягнецца не больш за два тыдні.

### ДАМАЎЛЯЮЦЦА БАЦЬКІ

Алена Агрызка адзначае, што апошнім часам пачала назірацца тэндэнцыя, калі жыллё для студэнтаў здымаюць праз агенцтва пераважна бацькі. І гэта тычыцца не толькі першакурснікаў, што, у прынцыпе, лагічна, а ўвогуле студэнтаў любых курсаў. Дарослыя займаюцца пошукам жылля, разглядаюць варыянты, сустракаюцца з гаспадарамі, якім потым даюць пісьмовыя гарантыі аб своечасовай аплаце і падтрыманні чысціні ў кватэры.

Спецыялісту агенцтва здаецца, што раней студэнты былі больш самастойныя. А вось з гэтым меркаваннем я згаджуся толькі часткова, бо... Справа ў тым, што цяпер гаспадары здымных кватэр усё часцей студэнтам адмаўляюць, бо падобныя варыянты імі ўвогуле не разглядаюцца. Бацькам у гэтым выпадку дамаўляцца з кватэраздатчыкамі лягчэй. Дарослыя пры заключэнні дагавораў абавязкова абменьваюцца тэлефонамі, каб усе магчымыя праблемы потым вырашаць, калі трэба, паміж сабой. Аднак жыллё з сучаснай мэбляй ці з якасным рамонтам не здаецца студэнтам нават пад гарантыі бацькоў.

Праўда, ва ўсякіх правілах існуюць і выключэнні. Напрыклад, ёсць у Мінску такія гаспадары шматпакаёвага жылля, якія здаюць яго выключна студэнтам. Для падобных уласнікаў галоўным прыярытэтам з'яўляюцца толькі грошы. Так, на мінулым тыдні ў новабудоўлі была здадзена вялікая па плошчы трохпакаёвая кватэра за 900 долараў. Сёння там жыве кампанія з 9 студэнтаў.

### ЭЛІТНАЕ ЖЫЛЛЁ БУДЗЕ ТАННЕЦЬ

Сапраўды, прапанова здымнага жылля гэтым летам істотна павялічылася. Калі бюджэтнае жыллё ў жніўні практычна цалкам адшукала сабе кватарантаў, то больш якаснае і дарагое — працягвае «вісець». Гэта тычыцца кватэр, якія прапануюцца за 600 долараў і даражэй. У першы месяц восені таннець яно яшчэ не будзе. Аднак ужо ў лістападзе, калі попыт на ўсе тыпы кватэр істотна знізіцца, гаспадары вельмі дарагіх памяшканняў (800-1500 долараў) будуць вымушаны паменшыць свае апетыты прыкладна на 200-300 долараў. Услед за гэтым пачне таннець і жыллё сярэдняга цэнавога дыяпазону. Прагназуецца, што бліжэй да зімы кватэры з цэннікам у межах 500-600 долараў могуць патаннець прыкладна на 50-80 долараў.

### СТУДЭНЦКІ АЖЫЯТАЖ ПРАДОЎЖЫЦЦА ДА СЯРЭДЗІНЫ ВЕРАСНЯ

Некаторыя студэнты і маладыя спецыялісты і сёння яшчэ не вырашылі сваё жыллёвае пытанне. Нехта з іх чакае месца ў інтэрнаце, частка спынілася ў знаёмых і сваякоў. На працягу наступных двух тыдняў яны падтрымаюць актыўнасць на рынку арэнды. Аднак гэтыя кліенты прадоўжаць шукаць выключна таннае жыллё. Менавіта таму кватэры ў бліжэйшы час даражэць ужо не будуць, лічыць Алена Агрызка.

**Нават «слабенькія хрушчоўкі» з сумежнымі пакойчыкамі ці пустыя кватэры ў новабудоўлях прапануюцца не танней чым за 430 долараў**

Потым чакаецца стабілізацыя цэннікаў і нават частковае вяртанне сённяшняга кошту. Гэта адбудзецца на фоне прагназуемага перасялення іншагародніх кватарантаў, якія ў кастрычніку-лістападзе знойдуць сабе больш таннае жыллё. Такое смелае меркаванне тлумачыцца ўстойлівым памяншэннем попыту на арэнднае прыватнае жыллё ў сталіцы. А апошняе назіраецца ў тым ліку таму, што ў Мінску пачалі больш актыўна будаваць арэндныя дамы і інтэрнаты. Праўда, галоўным фактарам памяншэння попыту на здымныя кватэры застаецца фінансавы дабрабыт будучых кватарантаў. Пры існуючых цэнах на харчаванне і адзенне ў людзей ужо не хапае грошай на арэнду па такім кошце.

### КВАТЭРЫ «НА СУТКІ» ЗНІКНУЦЬ НЕ ПАВІННЫ?

Нагадаю, што падобную прадпрымальніцкую дзейнасць планавалі забараніць у сталіцы ўжо праз месяц. Прапанову аб гэтым падрыхтавала сталічная інспекцыя па падатках і зборах. Афіцыйнай прычынай стала вялікая колькасць скаргаў на шум у «сутачных» кватэрах.

У мэрыі сталіцы гэтую прапанову падтрымалі. Была агучана інфармацыя аб тым, што на ўліку ў падатковых органах Мінска зарэгістравана больш за 700 індывідуальных прадпрымальнікаў, якія займаюцца пасутачнай здачай кватэр.

Алена Агрызка лічыць, што проста забараніць падобную прадпрымальніцкую дзейнасць немагчыма. У людзей павінен існаваць пэўны выбар па здымным жыллі. Практыка арэнды кватэр «на суткі» існуе ва ўсіх цывілізаваных краінах. Чаму ў нас гэта трэба забараніць? Тут мясцовыя ўлады могуць распрацаваць больш жорсткія правілы для падобнага жылля па шуме, вібрацыі і курэнні ў жылых памяшканнях і на балконах. Магчыма, што кватэры «на суткі» дазволяць арганізоўваць толькі на першых паверхах дамоў. Такія новаўвядзенні не толькі можна, але і трэба ўводзіць, лічыць наш эксперт. А проста забараніць патрэбную людзям паслугу, мякка кажучы, не зусім лагічна.

**Сяргей КУРКАЧ.**

■ Расклад на заўтра

## ПАРОГ НА ЦТ ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ ПАВЫСЯЦЬ?

**«Мінімальныя прахадныя балы пры паступленні ў вышэйшыя навучальныя ўстановы могуць быць скарэктаваны», — заявіў на форуме педагагічных работнікаў Магілёўскай вобласці міністр адукацыі Беларусі Сяргей МАСКЕВІЧ.**

«І калі мы пойдзем на гэты крок, то толькі з мэтай павышэння якасці беларускай адукацыі», — падкрэсліў міністр.

На думку кіраўніка галіны, у нас пакуль няма падстаў казаць пра зніжэнне якасці адукацыі. Па міжнародных ацэнках, канкурэнтаздольнасць беларускай адукацыі ў апошнія гады паступова расце. Хутчэй, можна разважаць пра абясцэньванне пэўных дыпломаў, да чаго прывяла масавасць вышэйшай адукацыі ў нашай краіне.

Нагадаем, што **сёлета цалкам запоўніць бюджэтныя месцы падчас першай хвалі залічэння ўдалося толькі пяці дзяржаўным ВНУ**. Таму давялося праводзіць дабор на вакантныя бюджэтныя месцы. Напрыклад, абітурыентам, якія паступалі ў рамках дадатковага набору на ваенныя, спартыўныя і сельскагаспадарчыя спецыяльнасці, дастаткова было мець у сертыфікаце ўсяго 3 балы. Прычым гэта тычылася ўсіх экзаменацыйных дысцыплін...

Да таго ж дэфіцыт абітурыентаў фактычна прывёў да таго, што сёлета амаль усе ахвотныя маглі стаць студэнтамі платнай формы навучання. Цікава, што колькасць платных месцаў у некаторых дзяржаўных ВНУ істотна перавышала колькасць бюджэтных месцаў па той жа спецыяльнасці. Адзінай перашкодай стала мінімальная планка, устаноўленая для ўдзельнікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Для маладых людзей, гатовых плаціць грошы за сваё навучанне, парог зніжаць не сталі. Напэўна, таму недзяржаўныя ВНУ ўвогуле засталіся без абітурыентаў?

**Надзея НІКАЛАЕВА**

■

## НОВЫЯ МАРЫ ПРА НОВЫ ШЛЯХ

**Сёння ў Мінску пачынае сваю работу дэлегацыя журналістаў сусветна вядомага інфармацыйнага агенцтва Сіньхуа (Кітайская Народная Рэспубліка).**

Беларуская сталіца — чарговая кропка, чарговы адрас у межах шырокамаштабнага міжнароднага прэс-тура «Новы шаўковы шлях — новая мара». Творчы і турыстычна-экскурсійны праект стартаваў у старажытнай сталіцы Кітая — горадзе Сіянь. За дваццаць адзін дзень падарожжа журналісты праехалі больш за 6000 кіламетраў і наведалі правінцыі Шэньсі, Ганьсу, а таксама Нінся-Хуэйскі і Сіньцзян-Уйгурскі аўтаномныя раёны. Гэта ў сябе на радзіме. Працягам сталі адрасы міжнароднага падарожжа. Найперш — порт Харгос на мяжы паміж Кітаем і Казахстанам. На працягу трыццаці дзён журналісты запланавалі наведаць Казахстан, Расію, Беларусь, Польшчу, Германію. Па дарозе ўдзельнікі прэс-тура наведаюць найбольш цікавыя мясцовыя прадпрыемствы, возьмуць інтэрв'ю ў знакамітых дзеячаў культуры, палітыкаў, высокіх дзяржаўных чыноўнікаў.

Першым прыпынкам на беларускай зямлі для кітайскіх гасцей стане мінская гасцініца «Пекін», якая з'яўляецца новым унікальным прыкладам беларуска-кітайскага супрацоўніцтва. Гэты сучасны гасцінічны комплекс бізнес-класа паспеў стаць сапраўднай вяршыняй у развіцці атэльнай сферы. Добрай дарогі, прыемных уражанняў, «Новы шаўковы шлях — новая мара». І ўсім журналістам «Сіньхуа» новых мар пра добрыя міратворчыя здзяйсненні, пра супольнае і мірнае развіццё ўсіх краін!

**Сяргей ШЫЧКО.**

■ Меркаванне

# У ДОБРЫ ШЛЯХ... НА РАСІЙСКІЯ ПАЛІЦЫ

## Плюсы і мінусы эмбарга для нашай краіны

**Вайна санкцый паміж Расіяй і Еўрапейскім саюзам на пару з ЗША згуляе на руку Беларусі. Чыноўнікі ўжо разглядаюць пазіцыі на рынку Расіі, якія магчыма запоўніць беларускай прадукцыяй, і прагназуюць шматмільённы прыбытак для краіны.**

У сітуацыі, якая зараз склалася, Беларусь выступіць як нейтральны пастаўшчык той самай прадукцыі, ад якой адмовіліся ў РФ. Расія плануе на год адмовіцца ад прадукцыі такіх пастаўшчыкоў, як ЕС, ЗША, Канада, Аўстралія і Нарвегія. У такіх абставінах для Беларусі адкрываецца шырокі рынак для рэалізацыі малака і малочнай і плодаагародніннай прадукцыі, а таксама мясных вырабаў.

Паводле папярэдніх звестак, валютная выручка ад паставак сельгаспрадукцыі і прадуктаў харчавання сёлета павінна наблізіцца да 6 мільярдаў долараў, што перавысіць леташні паказчык на суму да 400 мільёнаў. За студзень—ліпень 2014 года вытворчасць прадукцыі сельскай гаспадаркі ў бягучых цэнах склала 58,1 трлн рублёў і павялічылася ў параўнанні са студзенем—ліпенем 2013-га ў супастаўных цэнах на 7,8%. Вытворчасць прадукцыі раслінаводства ў гаспадарках усіх катэгорый павялічылася на 37,1%. Што тычыцца жывёлагадоўлі, то яна зменшылася на 5,4%. Аб'ём вытворчасці раслінаводства ў студзені—ліпені гэтага года вырас за кошт больш ранніх тэрмінаў уборкі збожжавых і зернебабовых культур і павелічэння іх ураджайнасці ў параўнанні з мінулым годам.

Намеснік прэм'ер-міністра Беларусі Міхаіл Русы назваў магчымае павелічэнне аб'ёмаў паставак прадукцыі ў РФ на другое паўгоддзе 2014-га: на 147-150% будуць павялічаны пастаўкі малочнай прадукцыі, паўфабрыкатаў мясных-каўбасных — са 115% да 140%, бульбы і гародніны — павялічацца на 40% (пастаўкі бульбы могуць павялічыцца ў 2 разы, што ў натуральным выражэнні складзе больш за 1 млн тон). Але з прычыны агульнай тэндэнцыі да зніжэння прадукцыі жывёлагадоўлі і памяншэння пагалоўя жывёлы ці магчыма дасягнуць падобных паказчыкаў і ў дастатковай меры забяспечыць і расійскі, і беларускі рынкі?

### ЦІ БУДЗЕ ПА КІШЭНІ БЕЛАРУСАМ БЕЛАРУСКАЕ?

На працягу ўсяго часу, пачынаючы з 12 жніўня, калі прадстаўнікі Расіі і Беларусі пачалі абмеркаванне колькасці паставак, расійскі бок неаднаразова рабіў запыты на павелічэнне першапачаткова разлічаных аб'ёмаў. Менавіта за кошт экспарту з Беларусі плануецца ліквідаваць магчымасць з'яўлення дэфіцыту прадуктаў харчавання ў Калінінградскай вобласці. Таксама з РФ паступіў адказ на рээкспарт забароненай да ўвозу прадукцыі з боку Беларусі, але ў той жа час Беларусь зможа пастаўляць у РФ перапрацаваную прадукцыю з еўрапейскай сыравіны. Расійскі бок падчас перамоў звярнуў асаблівую ўвагу на кантроль раслінаводчай прадукцыі. У гэтым выпадку на Беларусі ляжыць сур'ёзная адказнасць па доглядзе прадукцыі на прадмет яе бяспекі і наяўнасці карантынных аб'ектаў. Можна выказаць здагадку, што перапрацоўка дазволена РФ толькі таму, што сённяшнія пастаўшчыкі не здольны за кошт сваёй сыравіны цалкам забяспечыць рынак Расіі неабходнай прадукцыяй. Але ёсць яшчэ адно пытанне: ці не стануць беларускія тавары даражэй на ўнутраным рынку? Паколькі большая частка прадукцыі пойдзе на экспарт, то ўнутраны рынак будзе недастаткова забяспечаны. Вядома, магчыма будзе купіць садавіну, малако і мясную прадукцыю з ЕС і замяніць гэтай прадукцыяй патэнцыяльны дэфіцыт беларускага рынку. Такія прэцэдэнты ўжо мелі месца — Прэзідэнт даручаў ураду набыць тыя прадукты харчавання, якія назапасіліся на беларускай мяжы з-за расійскіх санкцый. Але тут з'яўляюцца яшчэ два пытанні. Ці будуць прадукты з ЕС мець прымальныя цэны з улікам выдаткаў на лагістыку? І ці будуць гэтыя прадукты такімі ж якаснымі, як беларускія? Бо яшчэ ў красавіку ў Міністэрства аховы здароўя былі пытанні да якасці польскіх яблыкаў, паколькі ў Швецыі яны былі канфіскаваны з гандлёвага абароту: у гатунку Gala выявілі высокатаксічнае рэчыва дыметаат. Пастаўшчыком гэтых яблыкаў выступала польская кампанія, якая таксама прадала амаль 30 тон яблыкаў Беларусі і Расіі. У сённяшняй сітуацыі пастаўшчыкі з ЕС, якія прадавалі сваю прадукцыі ў Расію, будуць спрабаваць збыць яе ў Беларусі. А за мінімізацыяй страт прыбытку можа стаяць жаданне збыць і няякасную прадукцыю.

**У сённяшняй сітуацыі пастаўшчыкі з ЕС, якія прадавалі сваю прадукцыю ў Расію, будуць спрабаваць збыць яе ў Беларусі.**

Вось і незразумела, чаго чакаць ад цэн на малако і мяса да канца года. І наогул, ці ўбачым мы менавіта беларускае малако і мяса на нашых прылаўках?



### ТОП «ЧОРНАГА СПІСА»

А якая з краін больш за ўсё пацерпіць ад немагчымасці экспартаваць прадукцыю ў Расію на працягу года? Паводле звестак мытнай службы РФ аб імпарце за 2013 год, у топ 5 трапляюць Нарвегія, якая пацерпіць найбольшы ўрон (больш за $1,15 млрд), Польшча (больш за $1,14 млрд), ЗША (больш за $0,84 млрд), Германія (больш за $0,81 млрд), Нідэрланды (больш за $0,7 млрд). Менш за ўсё пацерпіць Вялікабрытанія (больш за $66 млн), таму што ў Расію пастаўляецца вельмі малая доля ад агульнай колькасці экспарту сельскагаспадарчай прадукцыі Злучанага Каралеўства. Яна складае менш за 1 працэнт.

Найбольшыя страты на расійскім рынку мяса свіней панясе Данія (каля $318 млн). У сектары рыбы і морапрадуктаў больш за ўсё страціць Нарвегія (каля $1,14 млрд). Па экспарце малочнай прадукцыі найбольшую шкоду пацерпіць Фінляндыя (каля $317 млн). Што тычыцца садавіны, то тут лідзіруе Польшча, верагодныя страты якой складуць $497 млн. Яна ж страціць $250 млн на пазіцыях плодаагароднінай прадукцыі.

Асноўныя экспарцёры (а гэта 20 краін, уключаючы ЕС, ЗША і Канаду) на няздольнасці прадаць сваю прадукцыю ў Расію страцяць каля $9,16 млрд.

Варта таксама адзначыць, што прадукцыю менавіта гэтых краін Беларусь можа скупіць, каб запоўніць паліцы нашых магазінаў. Унутры ЕС будзе паніжэнне цэн на ўсе тыя пазіцыі, якія не змаглі экспартаваць у РФ. Калі расійскі бок не здыме забарону на ўвоз гэтай прадукцыі, то Беларусь зойме досыць выгаднае становішча: «сваё прададзім даражэй, у суседзяў купім танней».

### ЦІ ВАРТА ЧАКАЦЬ ПАВЕЛІЧЭННЯ ЗНЕШНЕГАНДЛЁВАГА САЛЬДА?

Адказ з'явіцца тады, калі наша краіна будзе з дакладнасцю ўпэўнена, што зможа паставіць увесь запланаваны аб'ём экспарту ў Расію. Федэральная антыманапольная служба Расійскай Федэрацыі дапускае змену санкцыйнага спіса прадукцыі па выніках маніторынгу. Падчас абмеркаванняў у Расіі плануецца разгледзець усе меры, накіраваныя на насычэнне ўнутранага рынку, у тым ліку ў частцы ўнясення змяненняў у спіс тавараў, у дачыненні да якіх уведзена забарона. Таксама ў РФ дапускаецца зніжэнне мытных ставак на шэраг харчовых тавараў, у дачыненні да якіх уведзена забарона і якія неабходныя для таго, каб насыціць унутраны рынак.

У любым выпадку, нават нягледзячы на магчымае змяненне Расіяй пераліку тавараў, забароненых да ўвозу, гэта не вельмі паўплывае на аб'ёмы беларускіх паставак. Але ўсё падлічыць можна толькі тады, калі ў Беларусі збяруць увесь ураджай, вызначаць шляхі, аб'ёмы паставак і цэны на сыравіну, якая будзе перапрацоўвацца і экспартавацца ў РФ у выглядзе гатовай прадукцыі, а таксама дакладна вызначаць шляхі напаўнення ўнутранага рынку. Таксама неабходна ўлічваць фактар канкурэнцыі. Бо ўжо цяпер Беларусь занепакоена магчымым экспартам тавараў з Еўрапейскага саюза праз Украіну ў Беларусь, Казахстан і Расію ў сувязі з падпісаннем Украінай дагавора аб асацыяцыі з ЕС. Ад гэтага можа пацярпець у першую чаргу наша эканоміка.

**Ілья КРЫЖЭВІЧ**

■

**СЫРНЫ ІНТАРЭС**

**Беларусь мае намер павялічыць у 1,4 раза пастаўкі малочнай прадукцыі ў Расію.**

У тым ліку са жніўня па снежань на расійскі рынак павінна паступіць каля 70 тысяч тон беларускіх сыроў, паведаміў міністр сельскай гаспадаркі і харчавання Беларусі Леанід Заяц.

«Нам няма неабходнасці павышаць цэны. Для нас галоўнае — прысутнічаць на расійскім рынку з нашым прадуктам», — сказаў міністр. Паводле яго слоў, Беларусь ужо пераглядае свой асартымент тавараў і нават гатова перапрафіляваць некаторыя малочныя прадпрыемствы.

Акрамя таго, наша краіна можа паставіць у Расію больш за 1 млн тон харчовай бульбы, больш за 200 тысяч тон агародніны, 100 тысяч тон мукі. Беларускі бок гатовы павялічыць і пастаўкі мяса.

**Паводле інфармацыі БЕЛТА.**

Звязда. Наперад у мінулае. Беларусь 3. Сумесны праект «Звязды» і «Беларусь 3»

# МЕСЦА, ДЗЕ ЖЫВУЦЬ ПЕСНІ

## КАРЭСПАНДЭНТ «ЗВЯЗДЫ» РАЗАМ З ТЭЛЕВІЗІЁНШЧЫКАМІ ЗДЗЕЙСНІЛА ВАНДРОЎКУ НАПЕРАД У МІНУЛАЕ

**Ужо не першы год творчая каманда Белтэлерадыёкампаніі вандруе па роднай зямлі ў пошуку таленавітых калектываў. Адметнасць тэлепраекту «Наперад у мінулае» перш за ўсё ў тым, што яго стваральнікі Анатоль і Аксана Вечар збіраюць песні па ўсёй Беларусі не толькі каб захаваць іх, але і даць ім новае жыццё: для аднаго з твораў робіцца сучасная аранжыроўка, і абноўленую кампазіцыю выконвае нехта з беларускіх артыстаў. Дарэчы, сёлета ў праграме нас чакаюць некаторыя кадравыя перамены. Юрыя Вашчука, які раней быў напарнікам Аксаны Вечар у праекце, цяпер заменяць іншыя аранжыроўшчыкі. А ў рэчышчы сумеснага праекта «Звязды» і тэлеканала «Беларусь 3» эфірныя выпускі атрымаюць працяг на старонках газеты. Каб папоўніць скарбонку песеннай творчасці, рушым у госці ў беларускую глыбінку.**



Народны ансамбль сям'і Бойка сёння.

Першая геаграфічная кропка, дзе мы спыняемся,— **вёска Гаўрыльчыцы Салігорскага раёна Мінскай вобласці.** Тут знаёмімся (а пазней знаёмім чытачоў і гледачоў) з народным ансамблем сям'і Бойка. Пакуль артысты настройваюцца на выступленне пад прыцэлам камер, спрабую завесці размову з удзельніцай гэтага калектыву.

Жанчыне 75 гадоў, і завуць яе Яня, хоць у пашпарце запісана як Ніна. Пра сваё незвычайнае па сённяшніх мерках імя кажа: «Бацька так захацеў. Казаў, недзе пры Польшчы была дзяўчына ў яго знаёмая прыгожая, дык вось так і назвалі».

— Ці даўно спяваеце? — пытаюся ў яе.

— З калектывам ездзілі выступаць больш за дзесяць гадоў, а так асабліва і не збіраемся ўжо, бо няма дзе,— дзеліцца мая суразмоўца.

Цікаўлюся ў Ніны Ільінічны, ці праяўляе мясцовая моладзь інтарэс да спеваў. Адказ, на жаль, не аптымістычны:

— Усе параз'язджаліся, нікога няма. Скончыўшы школу, едуць вучыцца, а там, дзе робяць, то і застаюцца. Адно што ходзяць у школу. Але ніхто імі не займаецца, каб спявалі ці яшчэ нешта,— з прыкрасцю кажа бабуля Яня, а потым дадае: — Я вось сваёй унучцы расказваю, што ведаю сама. Яна прыедзе ў госці і просіць, расказвай, маўляў, мне нешта пра тое, як было раней, але толькі праўду.

У самой жанчыны трое дзяцей: дзве дачкі і сын. Яна мае чатырох унукаў. Радасна і ў той жа час сумна, бо думаецца, што ў старасці нашым верным спадарожнікам становіцца адзінота, а дзеці — гасцямі пераступаюць родны парог... Аднак роздумы перарывае голас рэжысёра праекта Анатоля Вечара, які звяртаецца да ўдзельнікаў калектыву.

— Спяваем першую песню, каб мы маглі вас паслухаць, а потым пагаворым пра вас,— раздае настаўленні артыстам Анатоль Уладзіміравіч.— Пішам у тым парадку, як гэта будзе ў нас потым у праграме. І яшчэ вялікая просьба, калі вы расказваеце пра нешта, то хацелася б, каб усе выказваліся, але не разам, а паасобку. У нас вельмі якасныя мікрафоны, таму цішыня павінна быць ідэальнай.

Як вядома, рэжысёр на здымках чалавек галоўны, таму суразмоўца пакідае мяне, артысты рыхтуюцца да запеву, а я настройваюся на музычнае падарожжа.

*«... Ой у лузе лаза,*
*Пад лазою вада.*
*Там дзяўчына воду брала*
*Чарнабрыва молада...»*

Шматгалоссе мужчынскага хору пераплятаецца з галасамі жанчын, і такое адчуванне, быццам пераносішся ў іншы час, дзе жылі і кахалі, мірыліся з лёсам альбо спадзяваліся на лепшае заўтра... Слухаеш песню за песняй і думаеш: мабыць, не хлусяць тыя, хто кажа, быццам свет трымаецца на каханні... А яшчэ на турботах і марах пра шчасце... Так, напрыклад, у адной з песень расказваецца гісторыя дзяўчыны, якую маці аддала замуж за заможнага пана. І здавалася б, у таго і золата, і дабро, а маладая дзяўчына тужыць па хлопцу, у якога толькі сэрца і душа:

*«... Выйдзі, мамо, подзівіся,*
*Ты на зоры паглядзі,*
*Ці не плача твая доня*
*Ў чужой дальняй старане.*
*Не таго я, мама, плачу,*
*Бо чужая старана.*
*Ад таго я, мама, плачу,*
*Прайшла моладасць мая».*

— Калектыў пачаў сваё існаванне ў 1957 годзе, калі мой бацька Бойка Мікалай Аляксеевіч вярнуўся з арміі. Спявалі яны дуэтам з маці. Потым падрасталі дзеці: я, сёстры Святлана і Ірына. Паступова і мы ўліваліся ў гэты калектыў. А яшчэ больш разросся наш ансамбль у 1986 годзе, калі я сам пасля арміі атрымаў музычную адукацыю, — расказвае Валерый Бойка.— І тады да нас далучыліся пляменнікі Валодзя і Сцяпан, цётка Ксенія, Алеся,



«Песня і развесяліць, і роздумы падорыць», — гаворыць баба Яня.



Не дыплом пацвярджае талент, але калі ён ёсць — значыць, заўважылі.

Яня і многія іншыя. Так вось ужо на працягу стольких гадоў мы спяваем разам.

Не абышлося без гастроляў і ўзнагарод. Ансамбль быў адзначаны дыпломам аб прысваенні спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у намінацыі «Народная творчасць», з'яўляецца лаўрэатам ІІ Усебеларускага фестывалю народнага мастацтва «Беларусь — мая песня»... Не раз выступалі гаўрыльчыцкія артысты ў Палацы Рэспублікі і на «Дажынках» у Слуцку. У іх існуе традыцыя: калі едуць на выступленне, то абавязкова спяваюць у аўтобусе, а вяртаючыся з гастроляў, святкуюць сваю паездку. Песні выконваюць пераважна тыя, што дасталіся ад бабуль і дзядоў. Бывала, збіраліся на вечарыны і спявалі вясёлыя і даўнія песні, якія яшчэ іх бабулі ведалі. Недзе каля дзесяці самі зрабілі. Раней з калектывам спявала больш людзей. Як расказваюць удзельнікі, на рэпетыцыі збіралася па 40–50 чалавек, і песні для рэпертуару было лягчэй падбіраць.

— Існаваў у нас мужчынскі вакальны гурт, дзе былі ўдзельнікі Вялікай Айчыннай вайны. І песні яны прынеслі, можна сказаць, з фронту. У гэтую скарбніцу зрабілі ўклад і нашы родныя цёткі — ад бабулек сваіх, якія гэтыя песні запомнілі. Жылі па хутарах тады і спявалі на вечарынах,— дзеліцца Валерый Бойка.

...Каб перапыніць сумаваты настрой, ансамбль выконвае вясельную песню «Покуць, ты мая, покуць». *(Покуць — чырвоны кут у хаце, дзе віселі абразы.* — **Аўт.**).

«Покуць, ты мая покуць,
Хто ж цябе шанаваць будзе,
Я ж цябе да шанавала
Штосуботу да прыбірала».

Варта адзначыць, што месца вясельным песням і сёння ёсць у жыцці гэтай вёскі. Няхай і не ва ўсіх сем'ях, але пачуць іх можна. Таксама не зніклі яшчэ і некаторыя абрады, якія існуюць у гэтай мясцовасці здаўна.

Так, жыве традыцыя, што раніцай на Вялікдзень на самым досвітку трэба ісці на могілкі і занесці сваім памерлым «валачэнне». Гэта можа быць кавалачак булкі, яйка велікоднага. «Можна нейкага чалавека не бачыць пяць гадоў, а потым пайсці на могілкі на Вялікдзень і пабачыць усіх, хто з'ехаў,— расказваюць месцічы.— Гэтаксама робяць і на Спас, толькі нясуць яблыкі альбо грушкі ў пачастунак продкам».

— Ёсць абрад, які вясной спраўляўся, падчас Дабравешчання, 7 сакавіка, калі наступае ўжо сапраўдная каляндарная вясна. Тады «Закалыхванне» праводзілі. Цяпер тое крыху забылася. А раней, яшчэ гадоў трыццаць альбо дваццаць таму ў гэты дзень збіралася моладзь, дзеці і на нейкім вялікім дрэве вешалі калыску. І на ёй, як кажуць, трэба было закалыхацца, каб год прайшоў удала. Хлопцы бралі ручнік і высока-высока яго разгойдвалі. Такі вось мясцовы абрад цікавы,— распавядае Алена Грынько, настаўніца геаграфіі ў мясцовай школе, якая па сумяшчальніцтве яшчэ і курыруе школьны гісторыка-краязнаўчы музей.

Музей даволі малады — створаны ў 1998 годзе, экспазіцыя не вялікая, каля 300 экспанатаў, і ў асноўным сельскагаспадарчай тэматыкі. Размеркаваны яны па трох раздзелах: «Ільнаводства», «Рамёствы» (бортніцтва, бандарства), «Славутыя імёны Бацькаўшчыны».

На жаль, як давялося пачуць не ад аднаго чалавека, вёска Гаўрыльчыцы сёння вымірае. І зацікаўленасць песеннай спадчынай не настолькі яскрава праяўляецца, як хацелася б: іншы час і іншыя людзі. Але, ведаеце, чалавек рана ці позна вяртаецца да сваіх вытокаў, бо нельга ўцячы ад сябе, змяніўшы месца пражывання ці аддаючы перавагу толькі таму, што модна. Быць сабой і ведаць гісторыю роднай зямлі — гэта не проста модна ва ўсе часы, а па-сапраўднаму стыльна.

У вас ёсць жаданне ў чарговы раз пераканацца ў гэтым і пачуць непаўторныя спевы беларускай глыбінкі? Тады не прапусціце восеньскія выпускі праграмы «Наперад у мінулае» на тэлеканале «Беларусь 3».

**Алена ДРАПКО.**
**Фота аўтара.**

**Аксана ВЕЧАР, аўтар і вядучая праграмы «Наперад у мінулае»:**

— У новым сезоне з намі на пастаяннай аснове будзе супрацоўнічаць Кірыл Ермакоў, вядомы многім як удзельнік нацыянальнага фіналу дзіцячага «Еўрабачання», куды трапляў неаднаразова. У свой час ён нават напісаў песню, якая стала своеасаблівым гімнам конкурсу, а цяпер завочна вучыцца на аранжыроўшчыка ў Інстытуце сучасных ведаў імя Шырокава. Мае свой гурт і стаў фіналістам ад Беларусі на праекце «Голас». Таксама ў нас будуць, так бы мовіць, разавыя аранжыроўшчыкі, таму што ёсць музыканты, якія могуць самі апрацаваць для сябе песню.

**Сяргей МАКАРЭЙ, намеснік галоўнага дырэктара тэлеканала «Беларусь 3»:**

— Артыстаў для ўдзелу ў праекце мы выбіраем «з колаў» у залежнасці ад песні. Па-першае, улічваючы песенны матэрыял, мы выбіраем аранжыроўшчыка, а па-другое,— выканаўцу. Артысты таксама маюць выбар, у якім стылі выканаць песню. Гэта ўсё-такі творчы працэс, які не дазваляе наперад казаць, хто дакладна будзе ўдзельнікам таго ці іншага эфіру. Безумоўна, амаль усе артысты за гэтыя два гады існавання праекта выступалі ў ім . Хаця, зразумела, знаходзяцца і маладыя, мы эксперыментуем, заахвочваем, ды яны і самі прыходзяць. Бо праект дае ім магчымасць папоўніць свой рэпертуар, а нам адкрываць новыя імёны. Гэта добры старт. Мы адкрыты для супрацоўніцтва. З аднаго боку, мы аднаўляем пласт нацыянальнай культуры, а з другога боку, папулярызуем беларускую эстраду. Таму ўпэўнены: у гэтым годзе мы пачуем новыя песні і ўбачым новыя твары на экране.

Наконт афармлення. Мы пра гэта думаем, але, як кажуць, лепшае — вораг добрага. Ёсць праект, яго можна трансфармаваць новай графікай ці яшчэ нечым. Але ці варта гэта рабіць увогуле? У нас бывае так: з'яўляецца праект, а праз нейкі час яго закрылі і забыліся. Гэта, я лічу, няправільна, таму што ёсць нейкія брэндавыя рэчы, якія нельга закрываць. У праграме «Наперад у мінулае» графіка стылізаваная, у ёй адлюстравана аб'яднанне мінулага і сучаснасці. Таму ці варта мяняць гэты вобраз? Хаця думаем, можна нешта асвяжыць. Але не кардынальна. Музыка на тэлебачанні — гэта магчымасць нават без карцінкі пазнаць, якая праграма пачалася, таму гукавую застаўку мяняць не будзем. У нас сёння таксама ёсць мара — зрабіць усё, каб зрабіць праграму запатрабаванай у моладзі.

■ Тэлесеткі

# ЖЫВЫ ГУК НА ЛЮБЫ ГУСТ

**«У мяне таксама голас, я таксама спяваць хачу!» — абураўся калісьці нязграбны здаравяк Макар у «Прыгодах Электроніка». Цяпер, пры наяўнасці крупінкі таленту і вялікім жаданні, ён меў бы значна больш магчымасцяў для самавыяўлення. Як, зрэшты, і ўсякі іншы таленавіты малады чалавек. Тыя ж, каму больш даспадобы не выступаць, а слухаць іншых, змогуць ацаніць вынікі ў некалькіх тэлепраектах.**

Беларусы ў расійскай версіі сусветна вядомага шоу «The Voice» удзельнічалі ўжо некалькі сезонаў (у другім нават перамог наш суайчыннік Сяргей Ваўчкоў). А вось на экраны землякоў **праект «Голас»** прыйдзе ўпершыню. Пачынаючы з 5 верасня, кожную пятніцу гледачы АНТ змогуць сачыць, як таленавітыя вакалісты з розных краін СНД спрабуюць заявіць аб сабе і пакарыць сэрцы не толькі публікі, але і прыдзірлівага прафесійнага журы. З некалькіх тысяч прэтэндэнтаў у выніку жорсткага адбору засталося ўсяго 200 чалавек (сярод іх зноў ёсць беларусы!) і «рэзерв» — 30 удзельнікаў з мінулага сезона. Чый «Голас» будзе вырашальным на гэты раз?

Летась у выніку маштабнага міжнароднага тэлепраекта цалкам абнавіўся склад гурта «Віа ГРА» — аднаго з самых папулярных дзявочых трыа на постсавецкай прасторы. Але прадзюсару Канстанціну Меладзэ ў гэтых рамках стала ўжо цеснавата, таму шоу будзе працягвацца. На гэты раз — у «брутальным» фармаце **шоу «Хачу да Меладзэ».** На званне новых секс-сімвалаў поп-сцэны замахнуліся тысячы хлопцаў з Расіі, Украіны, Беларусі і Казахстана.

Прасейваць кандыдатаў у пошуку тых самых жамчужын будуць адразу два судзейскія саставы: жаночы — у складзе Ганны Седаковай, Евы Польны і Паліны Гагарынай — будзе адказваць за знешнюю частку шоу: спявачкі толькі ўбачаць, але не пачуюць выступленні ўдзельнікаў. Мужчынская ж калегія — Сяргей Лазараў, Цімаці і Уладзімір Праснякоў — наадварот, будзе ацэньваць выступленні выключна на слых. Удзельнікі, якія набяруць як мінімум 3 галасы ад усіх суддзяў, атрымаюць магчымасць працягнуць барацьбу за месца ў будучым гурце. Канчатковы выбар паміж дзвюма камандамі з наймацнейшых канкурсантаў павінны зрабіць гледачы.

Як адзначае беларуская сувядучая праекта Люцыя Лушчык, вельмі хочацца, каб і нашым хлопцам — а з соцень ахвотных запрашэнне на здымкі атрымалі ўсяго некалькі чалавек — усміхнулася ўдача. Наколькі яны самі таго вартыя — глядзім у шоу «Хачу да Меладзэ» на АНТ кожную суботу, пачынаючы з 6 верасня.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

# ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

## ПАНЯДЗЕЛАК, 1 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00** (з сурдаперакладам), **9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Дзелавое жыццё.
**7.10, 8.10, 19.40, 23.45** Зона Х.
**9.10** Галоўны эфір.
**10.05 Серыял «Сямейныя меладрамы».**
**11.00, 20.00 Серыял «Земскі доктар. Працяг».**
**12.10** Дзень у вялікім горадзе.
**13.15 Меладрама «Тэрмінова! Шукаю мужа».**
**15.15, 18.40** Навіны рэгіёна.
**15.25 Меладрама «Паненка-сялянка».**
**17.25** Нашы.
**17.35** Беларуская часінка.
**19.20** Арэна.
**21.00** Панарама.
**21.45 Серыял «След».**
**23.30** Актуальнае інтэрв'ю.
**0.20** Дзень спорту.
**0.30 Камедыя «Лары Краўн».**

### БЕЛАРУСЬ 2

**7.00** Раніца.
**9.00, 10.00, 21.30** Тэлебарометр.
**9.05, 16.40 Серыял «Сашка».**
**10.35 Маст. фільм «Казка аб страчаным часе».**
**11.55 Дэтэктыў «Марыя Верн: тайна мёртвых птушак». 1-я—4-я серыі.**
**15.20** «Comedy Батл. Без межаў».
**16.20** «Кіпень».
**17.50, 23.50 Серыял «Сцервы, або Дзівацтвы кахання».**
**18.50 Серыял «Універ».**
**19.50 Серыял «Інтэрны».**
**20.55** Мазгавы штурм.
**21.25** КЕНО.
**21.35 Серыял «Атэль «Вавілон».**
**22.45 Дэтэктыў «Кулінар».**
**23.45** Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

**7.20** «Дабраранак».
**7.50** «Хачу ўсё ведаць!».
**8.00, 12.35, 18.10, 21.15, 0.00** «Калейдаскоп».
**8.10 Дзіцячы фільм. «Дзе ты, Багіра?».**
**9.25, 10.50, 17.05** «Размаўляем па-беларуску».
**9.30 «Участак лейтэнанта Качуры». Заключная серыя. Маст. фільм.**
**10.20** «Камертон». Дзмітрый Салярцінскі.
**10.55 «Маленькая чорная кніжка». Маст. фільм.**
**12.45 Серыял «Мегрэ».**
**17.10** «Песня пра долю». Рок-опера.
**18.20** «Помнім, любім, спяваем...». Канцэрт памяці Уладзіміра Мулявіна.
**19.05 «Без сонца». Маст. фільм.**
**20.45** Калыханка.
**21.25 «Паляванне на апошняга жураўля». Маст. фільм.**
**23.05** Хіт-парад. «Сто песень для Беларусі».

### БЕЛАРУСЬ 5

**8.10** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Лестэр» — «Арсенал».
**10.00** Гандбол. SEHA-ліга. «БГК ім. Мяшкова» — «Борац».
**11.30** Хакей. Кубак Руслана Салея. Фінал.
**13.45** Баскетбол. ЧЕ-2015. Кваліфікацыя. Мужчыны. Македонія — Беларусь.
**15.25** Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» — «Гомель».
**17.15** Футбол. Суперкубак УЕФА. «Рэал» — «Севілья».
**19.20** Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Ліверпуль».
**21.10** Час футбола.
**21.55** Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
**22.50** Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Латвія — Беларусь.

### АНТ

**6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** (з субцітрамі), **20.30** Нашы навіны.
**6.05** «Наша раніца».
**9.05** Контуры.
**10.00** «Жыць здарова!».
**11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00** Навіны спорту.
**11.10 Серыял «Позняе раскаянне».**
**13.10 Серыял «След».**
**13.55** «Модны прыгавор».
**15.00** «Сам-насам з усімі».
**16.15** «Добры дзень».
**16.50** «Давай пажэнімся!».
**18.20** «Адваротны адлік. «ЮНЕСКА. Беларускі спіс».
**18.50** «Няхай гаворацць».
**20.00** Час.
**21.05 Серыял «Настаўнікі».**
**22.05** «Легенды Live».
**22.50** «Першая сусветная».
**23.55 Маст. фільм «Выдуманае жыццё Эбатаў».**



**1.55** Начныя навіны.

### СТБ

**6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30** «24 гадзіны».
**6.10, 17.20** «Мінshчына».
**6.20, 7.45** «Раніца. Студыя добрага настрою».
**7.40, 20.10, 22.55** «СТБ-спорт».
**8.30** «Тыдзень».
**9.45** «Чыстая работа».
**10.40, 17.30** «Званая вячэра».
**11.40 Меладрама «Аднойчы праз дваццаць гадоў».**
**13.10** «Глядзець усім!».
**13.50** «Вялікі горад».
**14.30** Музычны фестываль «Сяброўства».
**15.50** Дак. фільм «Сусветны экзамен».
**16.20** «Наша справа».
**16.50** «Следакі».
**18.30** «Дзіўная справа».
**20.00** «Сталічныя падрабязнасці».
**20.15 Маст. фільм «Прынада».**
**23.00** «Ваенная тайна».

### МІР

**5.00** «180 хвілін на снеданне».
**7.45** «Беларусь сёння».
**8.10, 23.30 Маст. фільм «Рызыка — высакародная справа».**
**9.35 Маст. фільм «Сведка».**
**11.10** Дак. серыял «У свеце ежы».
**12.00, 15.00, 18.00, 21.00** Навіны (бягучы радок).
**12.15 Серыял «Жаданая».**
**14.05** Дак. фільм «Тайныя знакі».
**15.15** Ток-шоу «Слова за слова».
**16.05 Серыял «Чэмпіён».**
**18.20, 2.10 Серыял «Адплата».**
**21.20 Маст. фільм «Марфа і яе шчанюкі».**
**22.45** «Навіны культуры».
**1.00** «Беларусь сёння».
**1.25 Серыял «Рускія страшылкі».**

### РТР—БЕЛАРУСЬ

**7.00** «Раніца Расіі».
**10.55** Надвор'е на тыдзень.
**11.00, 14.00, 17.00, 20.00** Весткі.
**11.30** «Прамы эфір».
**12.55** «Вялікія надзеі».
**13.50, 16.50, 19.50, 23.25** Навіны — Беларусь.
**14.30** Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
**15.40** «Скажам усім «Дабранач!».
**16.40** «Касманаўтыка».
**17.40 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».**
**18.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».**
**20.50 Серыял «Пазнай мяне, калі зможаш».**
**23.35** «Дзяжурны па краіне». Міхаіл Жванецкі.
**0.30** «Апошняя камандзіроўка. Памяці Віктара Ногіна і Генадзя Курынога».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

**6.00** «НТБ раніцай».
**8.05** «Да суда».
**9.05, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».**
**10.00, 13.00, 16.00, 19.00** Сёння.
**11.30, 17.30** Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
**11.55, 13.20** «Суд прысяжных».
**14.30** «Пракурорская праверка».
**15.30** «Ядзім дома!».
**16.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».**
**18.00** Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
**20.05 Серыял «Брат за брата».**
**22.00** Анатомія дня.
**22.55 Серыял «Мянтоўскія войны».**
**0.35 Серыял «Глухар. Вяртанне».**

### 8 КАНАЛ

**7.00, 12.50, 19.00, 20.55, 23.50** «Надвор'е».
**7.05, 16.05** Мультпарад.
**7.30 Камедыя «Няўлоўны».**
**10.20, 17.55 Серыял «Зніклы без вестак».**
**11.05 Драма «Страказа».**
**12.55** Дак. серыял «Гісторыя кантынента», «Заваяванне прыроды».
**13.40, 18.45** «Тэлемагазін».
**14.40 Серыял «Выкрадзеныя».**
**16.30** «VR-дайджэст».
**17.00 Серыял «Агенты».**
**19.05 Серыял «Лілехамер».**
**20.45** «Вечарніца».
**21.00 Дэтэктыў «Пералом».**
**23.05 Серыял «Да смерці прыгожая».**

### ВТБ

**6.00, 1.00** “PLAY”.
**8.00** М/ф «Смяшарыкі».
**8.30, 0.00** Скетч-шоу «6 кадраў».
**9.00** «Спытайце кухара».
**10.00** «Паспець за 24 гадзіны».
**11.00 Серыял «Свацця».**
**12.00** «Кіно ў дэталях».
**13.00, 23.30** Скетч-шоу «Даеш моладзь».
**14.00** Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
**15.00 Серыял «Галыгін.ru».**
**16.00 Прыгоды «Сахара».**
**18.30, 0.30** «Лаві момант».
**19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».**
**20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».**



**21.10 Меладрама «Пісьмы да Джульеты».**

### КУЛЬТУРА

**6.00** «Еўраньюс».
**9.00, 14.00, 18.00, 22.00** Навіны культуры.
**9.20 Маст. фільм «Андрэй Рублёў».**
**12.25** Дак. фільм «Іван Лапікаў. Балада пра акцёра...».
**13.05** Дак. фільм «Вавілонская вежа. Зямля сумленных людзей».
**14.10** Дак. фільм «Геніяльны шалапут. Фёдар Васільеў».
**14.50** «Больш, чым каханне». Андрэй Платонаў і Марыя Кашынцава.
**15.30** Дак. фільм «Бібліятэка Пятра: слова і справа».
**16.00** Шэдэўры рускай музыкі. Васіль Ладзюк і БСА імя П.І. Чайкоўскага.
**16.40** 85 гадоў з дня нараджэння Івана Фралова. Дак. фільм «Шлях да чалавека».
**17.15** Дак. серыял «Шукаю настаўніка». Фільм 1-ы.
**18.15** «Саці. Нясумная класіка...».
**19.00** «Правілы жыцця».
**19.30** «Добрай ночы, малыя!».
**19.40** «Тым часам».
**20.25** Да 100-годдзя пачатку Першай сусветнай вайны. Дак. серыял «На разломе эпох».
**21.00** Дак. фільм «Бляск і слава Старажытнага Рыма».
**21.50** Дак. фільм «Эдгар Дэга».
**22.20** «Рускі Гамлет».
**23.05** Дак. фільм «Георг Шолці. Стварыць Маэстра».
**0.40** Дак. фільм «Радыёхваля».
**1.35** Аркестравыя мініяцюры XX стагоддзя.

### НАСТАЛЬГІЯ

**5.00** «Зоркі польскай эстрады». Канцэрт.
**6.00** «Бліц». 1990 год.
**6.35** «Сузор'е Нікі». 1993 год.
**7.50** «Добры вечар, Масква! Шоу-дасье». 1991 год.
**9.10** Канцэрт замежнай эстрады.
**9.30 Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».**
**11.00** «Брэйн-рынг». 1990 год.
**11.50** «Шчаслівы выпадак». 1994 год.
**12.35** «50/50». 1991 год.
**13.50** «Сустрэчы для вас». 1994 год.
**14.35** «Знак пытання». 1990 год.
**15.00** «Тэатральныя сустрэчы». 1985 год.
**16.05** «Пакуль усе дома». 1992 год.
**16.35** «Спявае ВІА «Сіняя птушка». 1979 год.
**17.00** «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
**17.50** «А я іду...». Фільм-канцэрт.
**18.15** Дак. фільм «Вячэрні альбом. Лірычны лікбез».
**18.45 Маст. фільм «Белы шаман». 1-я серыя.**
**20.00, 2.00** «Мінулы час».
**21.00** «Народжаны ў СССР».
**22.00** «Бенефіс Таццяны Даронінай». 1-я частка. Фільм-канцэрт.
**23.00** Дак. фільм «Аляксандр Каверзнеў. Фатальная тэма».
**0.00** «Залатая пласцінка». 1985 год.
**0.30** Т/фільм «Следства вядуць Знатакі». Справа №11: «Любой цаной». 2-я частка.
**1.25** «У вольны ад працы час». Фільм-канцэрт.
**3.00** «Колба часу».
**4.05** «Погляд». 1995 год.

### EUROSPORT

**4.00, 11.00, 15.45, 22.05, 2.05** Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты турнір ЗША.
**10.30** Ралі. ERC.
**14.00** Конны спорт. Сусветныя конныя гульні.
**15.30** WATTS.
**22.00, 2.00** Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

### КАМЕДЫЯ

**5.00, 9.15, 2.10** Серыял «Я і місіс Джонс».
**6.00** Камедыя «Дзеля кахання да Мэры».
**7.30** Камедыя «Любовь-морковь».
**10.15** Прыгоды «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
**12.05** Камедыя «Любовь-морковь-2».
**13.50, 16.35, 21.00** Серыял «Месяцовы хлопчык».
**14.40** Камедыя «Прынц і танцоўшчыца».
**17.25** Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
**19.00, 21.50, 23.55** Скетчком «Паміж намі».
**19.20** Камедыя «Увесь я».
**22.10** Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе».
**0.15** Камедыя «Оскар».
**3.15** Прыгоды «Прыкінься маім мужам».

### ТБ3

**6.00** М/ф.
**8.10** «Сардэчна запрашаем дадому!».
**8.50, 18.30, 2.25** Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
**10.30** «Паненка і кулінар».
**11.00, 4.25** Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
**12.45, 17.30** Дак. серыял «Справа Астахава».
**13.40, 17.00, 4.00** Дак. серыял «Простыя складанасці».
**14.10** «Жонка. Гісторыя кахання». Лада Фяцісава.
**15.25** «Сто пытанняў даросламу». Карэн Шахназараў.
**16.10, 22.00** «Зорныя гісторыі».
**20.15** Серыял «Мы з будучыні». Заключная серыя.
**21.10, 1.45** Серыял «Казакі-разбойнікі». Заключная серыя.
**22.50** Серыял «Паляўнічыя на чужых».
**23.45** «Асцярожна, махляры!».
**0.10** «Часова даступны». Ціна Кандэлакі.
**1.05** «Без падману».

### ТБ1000

**5.00** Драма «Забытыя жаданні».
**7.10** Драма «Закаханыя».
**9.10** Фэнтэзі «Тайна Мунакра».
**11.10** Трагікамедыя «Пажыццёва».
**13.10** Драма «Басанож па смаўжах».
**15.10** Камедыя «СМСуальнасць».
**16.50** Драма «Мой хлопец — псіх».
**19.00** Драма «Хованка».
**21.10** Драма «Што хавае хлусня».
**22.50** Камедыя «Каханне: Інструкцыя па прымяненні».
**1.00** Трагікамедыя «Рок-зорка».
**3.00** Драма «Забароненае каханне».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

**5.20** Камедыя «Лёгкае жыццё».
**7.20** Камедыя «Дзед 005».
**9.10** Трагікамедыя «Кококо».
**10.50** Дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».
**13.30** М/ф «Карлік Нос».
**15.10** Камедыя «Стылягі».
**17.30** Трылер «Фанаграма страсці».
**19.20** Камедыя «Горка!».
**21.10** Камедыя «На здрадзе».
**22.45** Камедыя «Вось гэта каханне!».
**0.30** Камедыя «Вяселле».
**2.30** Фэнтэзі «Незвычайныя прыгоды Карыка і Валі».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

**5.00** Інжынерныя ідэі.
**6.00, 7.30, 19.00** Навуковыя недарэчнасці.
**7.00** Зрабі або памры.
**8.00, 13.00** Прызнанні нацыстаў.
**9.00, 14.00, 2.00** Суперзбудаванні Трэцяга рэйха.
**10.00** Перш за ўсё — самалёты.
**11.00** Золата горада-прывіда.
**12.00** Гульні розуму.
**12.30** Займальная навука.
**15.00** Астравы.
**16.00** Тайнае жыццё драпежнікаў.
**17.00** Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
**18.00** Аўта-SOS .
**20.00, 0.00, 3.00** Фатальная стыхія.
**21.00, 1.00, 4.00** Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
**22.00** Космас: Прастора і час.
**23.00** Расследаванні авіякатастроф.

### DISCOVERY

**7.00** Дамы на дрэвах.
**7.50** Што ў вас у гаражы?
**8.40, 13.15, 20.35** Як гэта ўстроена?
**9.10, 13.40, 20.05, 4.45** Як гэта зроблена?
**9.35, 23.00** Рачныя монстры.
**10.30, 5.10** Залатая ліхаманка.
**11.25, 16.25** Каралі аўкцыёнаў.
**12.20, 0.55** Top Gear.
**14.10, 3.55** Хуткія і гучныя.
**15.05, 6.05** Махінатары.
**16.00** Пятая перадача.
**17.20** Горад навыварат.
**18.15** Скрозь кратовую нару.
**19.10** Уладары розуму.
**21.00** Пякельныя трасы.
**22.00** Траса Калыма.
**0.00, 3.05** Паляўнічыя на рэліквіі.
**1.50** Сапраўдныя аферысты.
**2.40** Маланкавыя катастрофы.

## АЎТОРАК, 2 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 23.30 Зона Х.
9.10, 21.45 Серыял «След».
11.00, 20.00 Серыял «Земскі доктар. Працяг».
12.10 Дзень у вялікім горадзе.
13.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы».
14.05 Серыял «Фурцава».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Дэтэктыў «Логава Змея».
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
0.25 Дзень спорту.
0.35 Дэтэктыў «Турэцкі гамбіт». 1-я серыя.



### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.30 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Сашка».
10.15 «Два з паловай кухары».
10.45, 22.45 Дэтэктыў «Кулінар».
11.55, 21.35 Серыял «Атэль «Вавілон».
13.25 «Кіпень».
13.45, 18.50 Серыял «Універ».
14.50, 19.50 Серыял «Інтэрны».
16.00 Вышэй за дах.
17.50, 23.55 Серыял «Сцервы, або Дзівацтвы кахання».
20.55 Мазгавы штурм.
21.25 КЕНО.
23.50 Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.30, 19.25, 21.10, 0.35 «Калейдаскоп».
8.10 «Паляванне на апошняга жураўля». Маст. фільм.
9.50, 18.55, 22.35 «Дыя@блог». «Пра літаратуру».
10.15 «Без сонца». Маст. фільм.
12.00, 14.05, 19.35 «Размаўляем па-беларуску».
12.05, 0.05 «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара Уладзіміра Дамарацкага.
12.40 «Маладзечна-2014». Спадчына «Песняроў». Канцэрт, прысвечаны 45-годдзю дзяржаўнага ансамбля «Песняры».
14.10 Серыял «Мегрэ».
19.40 «Ехалі ў трамваі Ільф і Пятроў». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
21.25, 23.00 «Жорсткі раманс». Маст. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

8.10 Футбол. Чэмпіянат Англіі. Агляд тура.
9.00 Час футбола.
9.45 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ. БАТЭ (Беларусь) — «Слован» (Славакія).
11.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Раўнд плэй-оф. Матч у адказ. «Зеніт» (Расія) — «Стандард» (Бельгія).
13.30 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Вячэрняя сесія.
16.05 Тэніс. Турнір ВТА. Нью-Хэйвен. Паўфіналы.
19.15 Спорт-кадр.
19.45 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Расія — Беларусь.
22.00 Футбол. Чэмпіянат Англіі. «Тотэнхэм» — «Ліверпуль».

### АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Позняе раскаянне».
13.10 «Смак».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Сам-насам з усімі».
16.15 «Добры дзень».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Зайцаў + 1».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Настаўнікі».
23.05 «Першая сусветная».
0.05 Прыгоды «Палёт Фенікса».
2.00 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Мінshчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00 «Дзіўная справа».
10.00 «Цэнтральны рэгіён».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.50 Драма «Фантомны боль».



15.35 «Мае цудоўныя...».
16.50 «Следакі».
18.30 «Нам і не снілася»: «Грандыёзны мужчынскі падман». 1-я частка.
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Камедыя «Паліцэйская акадэмія 3: паўторнае навучанне».
22.00 «Глядзець усім!».
23.00 «Разумней не прыдумаеш».
23.55 «Аўтапанарама».
0.15 Серыял «Баец».

### МІР

5.00 «180 хвілін на снеданне».
7.45 «Агульны інтарэс».
8.10, 0.00 Маст. фільм «Гэта мы не праходзілі».
9.45 Маст. фільм «Розыгрыш».
11.15 Дак. серыял «У свеце прыгажосці».
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны (бягучы радок).
12.15 Серыял «Агульная тэрапія».
14.05 Дак. фільм «Тайныя знакі».
15.15, 23.10 Ток-шоу «Слова за слова».
16.05 Серыял «Чэмпіён».
18.20, 2.10 Серыял «Адплата».
21.20 Маст. фільм «Скрыжаванне».
1.45 «Агульны інтарэс».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.55 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Прысязе верныя».
16.40 «Факты».
17.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».
19.20 «Навука 2.0».
20.50 Серыял «Пазнай мяне, калі зможаш».
23.30 «Атамная драма Уладзіміра Баркоўскага».
0.25 «Дзеці індыга».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.05 «Да суда».
9.05, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.30, 17.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
11.55, 13.20 «Суд прысяжных».
14.30 «Пракурорская праверка».
15.30 «Справа густу».
16.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
20.05 Серыял «Брат за брата».
22.00 Анатомія дня.
22.55 Серыял «Мянтоўскія войны».
0.35 Серыял «Глухар. Вяртанне».

### 8 КАНАЛ

7.00, 13.00, 18.55, 20.55, 23.40 «Надвор'е».
7.05, 16.20 Мультпарад.
7.30, 19.00 Серыял «Лілехамер».
9.30, 17.45 Серыял «Зніклы без вестак».
10.15 «Кінаблакнот».
10.30 «Тэлемагазін».
11.00 Дэтэктыў «Пераслом».
13.05 Дак. серыял «Гісторыя кантынента», «Новае тысячагоддзе».
14.00 Серыял «Выкраданыя».
15.30, 22.55 Серыял «Да смерці прыгожая».
16.40 «Золата маўчання».
17.00 Серыял «Дрыжыкі».
18.30 «Тваё здароўе».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.10 Меладрама «Сустрэчны вецер».

### ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
10.00 «Лёс без ахвяр».
11.00 Серыял «Свацця».
12.00, 20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
13.00, 23.00 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.00 Серыял «Галыгін.ru».
16.00 Меладрама «Пісьмы да Джульеты».
18.30, 0.30 «Лаві момант».
21.10 Баявік «Шырока шагаючы».

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.00 Навіны культуры.
9.20, 22.20 Маст. фільм «Гамлет».
11.55, 17.15 Дак. серыял «Шукаю настаўніка».
12.35 «Пятае вымярэнне».
13.10, 21.00 Дак. фільм «Бляск і слава Старажытнага Рыма».
14.10 «Саці. Нясумная класіка...».
14.50 «Астравы». Ілья Фрэз.
15.30 «Сусветныя скарбы культуры».
15.50 Шэдэўры рускай музыкі. Рамансы выконвае Дынара Аліева.
16.50 «Тайна скрыпічнай душы». Частка 1-я.
18.15 Штучны адбор.
19.00 «Правілы жыцця».
19.30 «Добрай ночы, малыя!».
19.40 «Гульня ў бісер».
20.25 Дак. серыял «На разломе эпох».
21.50 Дак. фільм «Антоніа Сальеры».
0.55 Камерны ансамбль «Салісты Масквы».

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «Брэйн-рынг». 1990 год.
5.50 «Шчаслівы выпадак». 1994 год.
6.35 «50/50». 1991 год.
7.50 «Сустрэчы для вас». 1994 год.
8.35 «Знак пытання». 1990 год.
9.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1985 год.
10.05 «Пакуль усе дома». 1992 год.
10.35 «Спявае ВІА «Сіняя птушка». 1979 год.
11.00 «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
11.50 «А я іду...». Фільм-канцэрт.
12.15 Дак. фільм «Вячэрні альбом. Лірычны лікбез».
12.45, 18.45 Маст. фільм «Белы шаман».
14.00, 20.00 «Мінулы час».
15.00, 21.00 «Народжаныя ў СССР».
16.00, 22.00 «Бенефіс Тацяны Даронінай». Фільм-канцэрт.
17.00 Дак. фільм «Навошта вы збіраецеся?».
17.40 «Масква — Космас — Каліфорнія». Канцэрт.
18.25, 3.10 Канцэрт замежнай эстрады.
23.00 «Зоркі польскай эстрады». Канцэрт.
0.00 «Бліц». 1990 год.
0.35 «Сузор'е Нікі». 1993 год.
1.50 «Добры вечар, Масква! Шоу-дасье». 1991 год.
3.30 Маст. фільм «Небяспечны ўзрост».

### EUROSPORT

4.00, 10.30, 18.45, 22.05, 2.05 Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты турнір ЗША.
9.30, 15.30 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
14.00 Конны спорт. Сусветныя конныя гульні.
14.30 WATTS.
22.00, 2.00 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

### КАМЕДЫЯ

5.00, 2.10 Серыял «Я і місіс Джонс».
6.00 Камедыя «Любовь-морковь».
7.45 Камедыя «Любовь-морковь-2».
9.20, 13.40, 16.30 Серыял «Месяцовы хлопчык».
10.10 Камедыя «Прынц і танцоўшчыца».
12.05 Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
14.30 Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе».
16.10, 18.55, 23.55 Скетчком «Паміж намі».
17.20 Камедыя «Увесь я».
19.20 Камедыя «Няўдачлівыя».
21.00 Серыял «Сваты». 1-я серыя.
22.10 Камедыя «Як разабрацца са справамі».
0.15 Прыгоды «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».
3.10 Камедыя «Оскар».

### ТБ3

6.00 М/ф.
8.25, 14.35 «Доктар І...».
8.55, 18.30, 1.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
10.30, 4.20 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
12.15, 17.30 Дак. серыял «Справа Астахава».
13.10, 17.00, 3.05 Дак. серыял «Простыя складанасці».
13.45 Серыял «Мы з будучыні». Заключная серыя.
15.05, 23.55 Серыял «Тайны следства».
16.00, 22.05, 3.30 «Зорныя гісторыі».
20.15 Серыял «Усё пачалося ў Харбіне».
21.10, 0.45 Серыял «Загадка для Веры».
23.00 Серыял «Паляўнічыя на чужых».

### ТБ1000

5.00 Трагікамедыя «Пажыццёва».
7.10, 16.50 Камедыя «Каханне: Інструкцыя па прымяненні».
9.30 М/ф «Гномеа і Джульета».
11.10 Камедыя «Нагледзеўшыся дэтэктываў».
13.00 Драма «Забытыя жаданні».
14.50 Драма «Забароненае каханне».
19.00 Драма «Ромавы дзённік».
21.05 Драма «Вялікія надзеі».
23.20 Драма «Мушкецёры».
1.20 Камедыя «Слава».
3.15 Камедыя «Пастка для нявесты».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

5.20 Драма «Гарпастум».
7.30 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
9.10 Камедыя «Самка».
10.40 Дэтэктыў «Лёс рэзідэнта».
13.30 Фэнтэзі «Рэальная казка».
15.30 Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
17.30 Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
19.20 Камедыя «Аднакласнікі.ru: НаCLICKай удачу».
21.10 Камедыя «Дзед 005».
22.55 Драма «Бедуін».
0.45 Камедыя «Набожная Марта».
3.40 Драма «Дом з вежкай».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Інжынерныя ідэі.
6.00, 12.00 Гульні розуму.
6.30, 12.30 Займальная навука.
7.00 Зрабі або памры.
7.30, 20.00, 22.00, 0.00, 3.00 Навуковыя недарэчнасці.
8.00, 13.00 Фатальная стыхія.
9.00, 14.00 Вялікія рэйды Другой сусветнай вайны.
10.00 Суперзбудаванні.
11.00 Золата горада-прывіда.
15.00 Астравы.
16.00 Тайнае жыццё драпежнікаў.
17.00, 2.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.
18.00 Аўта-SOS .
19.00, 21.00, 1.00, 4.00 Паядынак непераможных.
23.00 Ліхтугі за мяжой.

### DISCOVERY

7.00, 17.20 Рачныя монстры.
7.50 Хуткія і гучныя.
8.40, 13.15, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 13.40, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Рэальныя дальнабойшчыкі.
10.30, 5.10 Горад навыварат.
11.25, 16.25 Паляўнічыя на рэліквіі.
12.20, 0.55 Top Gear.
14.10, 3.55 Паляўнічыя на аўтамабілі.
15.05, 22.00, 6.05 Махінатары.
16.00 Пятая перадача.
18.15 Траса Калыма.
19.10 Пякельныя трасы.
21.00 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
23.00 Вулічныя гонкі.
0.00, 3.05 Бітва за нерухомасць.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

## СЕРАДА, 3 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.00 Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 23.45 Зона Х.
9.10, 21.45 Серыял «След».
11.00, 20.00 Серыял «Земскі доктар. Працяг».
12.10 Дзень у вялікім горадзе.
13.10, 16.30 Серыял «Сямейныя меладрамы».
14.00 Серыял «Фурцава».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Дэтэктыў «Логава Змея». Заключная серыя.
17.35 Беларуская часінка.
19.20 Спецыяльны рэпартаж.
21.00 Панарама.
23.30 Актуальнае інтэрв'ю.
0.20 Дзень спорту.
0.30 Дэтэктыў «Турэцкі гамбіт».

### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.35 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Сашка».
10.10 «Два з паловай кухары. Адкрытая кухня».
10.45, 22.50 Дэтэктыў «Кулінар».
11.55, 21.40 Серыял «Атэль «Вавілон».
13.35, 18.50 Серыял «Універ».
14.40, 19.50 Серыял «Інтэрны».
15.50 Рэпарцёр.
17.50, 0.00 Серыял «Сцервы, або Дзівацтвы кахання».
20.55 Мазгавы штурм.
21.25 Спортлато 5 з 36.
21.30 КЕНО.
23.55 Хачу ў тэлевізар!

### БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.30, 19.05, 21.10, 0.30 «Калейдаскоп».
8.10 «Ехалі ў трамваі Ільф і Пятроў». Маст. фільм.
9.20, 16.40, 22.30 «Дыя@блог». «Пра прыгожае».
9.45 «Жорсткі раманс». Маст. фільм.
12.00, 13.10, 15.00, 17.05, 19.15 «Размаўляем па-беларуску».
12.05, 0.05 «Святло далёкай зоркі». Памяці кампазітара і дырыжора Барыса Райскага.
12.45 «Званы часу. Сяргей Давідовіч». Дак. фільм.
13.15 «Запаведнымі сцежкамі беларускай зямлі». Дак. фільм.
14.05 «Містыка ўлады». «Пасля параду». Дак. фільм.
14.35 «Містыка ўлады». «Мара імперыі». Дак. фільм.
15.05 «Небяспечны талент». Жыццёвы і творчы шлях паэтэсы Яўгеніі Янішчыц.
15.30 «Верасень 1943. Недзіцячы дзённік». Дак. фільм.
15.55 Серыял «Пракляты ўтульны дом».
17.10 «Правінцыйны анекдот». Кароткаметражны фільм.
17.45 «Пачынаецца ўсё з любві». Канцэрт Нацыянальнага акадэмічнага народнага аркестра імя І. Жыновіча.
19.20 «Пунсовыя ветразі». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
21.25, 23.00 «Некалькі дзён з жыцця І.І. Абломава». Маст. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

8.10 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ. «Насьянал» (Партугалія) — «Дынама» (Мінск).
10.05 Футбол. Ліга Еўропы УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ. «Шахцёр» (Расія) — ПСВ (Нідэрланды).
12.00 Гандбол. SEHA-ліга. «БГК ім. Мяшкова» — «Борац».
13.30 Спорт-кадр.
14.00 Козел пра футбол.
14.15 Лёгкая атлетыка. Чэмпіянат Еўропы. Вячэрняя сесія.
16.25 Тэніс. Турнір ВТА. Нью-Хэйвен. Фінал.
18.10 Футбол. Беларусбанк — чэмпіянат Беларусі. «Тарпеда-БелАЗ» — «Гомель».
20.00 Баскетбол. ЧЕ-2015. Кваліфікацыя. Беларусь — Бельгія.
21.50 Хакей. Чэмпіянат свету-2014. Беларусь — Германія.

### АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Позняе раскаянне».
13.10 «Смак».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Сам-насам з усімі».
16.15 «Добры дзень».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Зайцаў + 1».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Настаўнікі».
23.05 «Першая сусветная».
0.05 Маст. фільм «Верныя хады».
1.45 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00, 18.30 «Нам і не снілася»: «Грандыёзны мужчынскі падман».
9.55 Серыял «Чыста па жыцці».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.50 Камедыя «Паліцэйская акадэмія 3: паўторнае навучанне».
15.30 «Мае цудоўныя...».
16.50 «Следакі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Маст. фільм «Вам пісьмо».
23.00 «Сакрэтныя тэрыторыі».
23.55 «Скардзіцца дазваляецца».
0.15 Серыял «Баец».

### МІР

5.00 «180 хвілін на снеданне».
7.45 «Зроблена ў СССР».
8.10, 0.00 Маст. фільм «Барані мяне, мой талісман».
9.30 Маст. фільм «Марфа і яе шчанюкі».
11.05 Дак. серыял «У свеце ежы».
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны (бягучы радок).
12.15 Серыял «Агульная тэрапія».
14.05 Дак. фільм «Тайныя знакі».
15.15, 23.10 Ток-шоу «Слова за слова».
16.05 Серыял «Чэмпіён».
18.20, 2.25 Серыял «Адплата».
21.20 Маст. фільм «Аднакласніцы».
1.20 «Зроблена ў СССР».
1.45 Серыял «Рускія страшылкі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.55 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
13.50, 16.50, 19.50, 23.20 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Два залпы па канструктары. Драма «Кацюшы».
16.40 «Факты».
17.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».
19.20 «Навука 2.0».
20.50 Серыял «Пазнай мяне, калі зможаш».
23.30 «Транспартная рэвалюцыя».
0.25 «Маскоўскі дэтэктыў. Чорная воспа».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.05 «Да суда».
9.05, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.30, 17.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
11.55, 13.20 «Суд прысяжных».
14.30 «Пракурорская праверка».
15.30 «Справа густу».
16.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
20.05 Серыял «Брат за брата».
22.00 Анатомія дня.
22.55 Серыял «Мянтоўскія войны».
0.35 Серыял «Глухар. Вяртанне».

### 8 КАНАЛ

7.00, 12.40, 18.35, 20.55, 23.35 «Надвор'е».
7.05, 16.05 Мультпарад.
7.30 «Тваё здароўе».
7.50 Серыял «Лілехамер».
9.30, 17.35 Серыял «Зніклы без вестак».
10.15 «Кінаблакнот».
10.30 «Адшукваецца адпачынак».
11.00 Меладрама «Сустрэчны вецер».
12.45 Дак. фільм «Змова сабак».
13.40 Серыял «Выкраданыя».
15.15, 22.50 Серыял «Да смерці прыгожая».
16.30 «Золата маўчання».
16.45 Серыял «Дрыжыкі».
18.20 «Тэлемагазін».
18.40 Серыял «Амерыканцы».
20.45 «Вечарніца».
21.00 Драма «Усё самае лепшае».

### ВТБ

6.00, 1.00 «PLAY».
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 17.50, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
10.00 «Лёс без ахвяр».
11.00 Серыял «Свацця».
12.00, 20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
13.00, 23.15 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.00 Серыял «Галыгін.ru».
16.00 Баявік «Шырока шагаючы».
18.30, 0.30 «Лаві момант».
21.10 Фэнтэзі «Брама».

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.00 Навіны культуры.
9.20, 22.20 Маст. фільм «Гамлет».
11.45 Дак. фільм «Берастабяроста».
11.55, 17.15 Дак. серыял «Шукаю настаўніка».
12.35 «Красуйся, горад Пятроў!». Дойлід Аляксандр Памяранцаў.
13.10 Дак. фільм «Бляск і слава Старажытнага Рыма».
14.10 Штучны адбор.
14.50 «Ён быў самадастатковы... Павел Масальскі».
15.30 «Сусветныя скарбы культуры».
15.50 Шэдэўры рускай музыкі. Дзмітрый Корчак і хор Акадэміі харавога мастацтва імя В.С. Папова.
16.40 Дак. фільм «Канстанцін Цыялкоўскі».
16.50 «Тайна скрыпічнай душы».
18.15 «Абсалютны слых».
19.00 «Правілы жыцця».
19.30 «Добрай ночы, малыя!».
19.40 Улада факта. «Сусветная гісторыя кавы».
20.25 Дак. серыял «На разломе эпох».
21.00 Дак. фільм «Старажытны Егіпет — жыццё і смерць у Даліне Цароў».
0.45 Дак. фільм «Джордж Байран».
0.55 Канцэрт з твораў Радзівона Шчадрына.

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
5.50 «А я іду...». Фільм-канцэрт.
6.15 Дак. фільм «Вячэрні альбом. Лірычны лікбез».
6.45, 12.45, 18.40 Маст. фільм «Белы шаман».
8.00, 14.00, 20.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 16.00 «Бенефіс Тацяны Даронінай». Фільм-канцэрт.
11.00 Дак. фільм «Навошта вы збіраецеся?».
11.40 «Масква — Космас — Каліфорнія». Канцэрт.
12.25 Замежная эстрада.
17.00 Дак. фільм «Успаміны перад стартам».
18.10 «Дзейныя асобы і...». Фільм-канцэрт.
22.00 «Вакол смеху». 1-я частка. 1979 год.
23.00 «Брэйн-рынг». 1990 год.
23.50 «Шчаслівы выпадак». 1994 год.
0.35 «50/50». 1991 год.
1.50 «Сустрэчы для вас». 1994 год.
2.35 «Знак пытання». 1990 год.
3.00 «Тэатральныя сустрэчы». 1985 год.
4.05 «Пакуль усе дома». 1992 год.
4.35 «Спявае ВІА «Сіняя птушка». 1979 год.

### EUROSPORT

4.00, 11.00, 15.00, 18.45, 22.05, 2.05 Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты турнір ЗША.
9.30, 16.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
10.30 Ралі. За кулісамі ERC.
13.30 WATTS.
14.00 Конны спорт. Сусветныя конныя гульні.
22.00, 2.00 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

### КАМЕДЫЯ

5.00, 9.05, 13.30, 2.10 Серыял «Месяцовы хлопчык».
5.50 Камедыя «Любовь-морковь-2».
7.30 Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
9.55 Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе».
11.45 Камедыя «Увесь я».
14.20 Камедыя «Як разабрацца са справамі».
16.15, 21.00 Серыял «Сваты».
17.25 Камедыя «Няўдачлівыя».
19.20 Фэнтэзі «Прывід з шафёрам».
20.45, 23.45 Скетчком «Паміж намі».
22.10 Камедыя «Вяселле Бэтсі».
0.15 Камедыя «Прынц і танцоўшчыца».
3.00 Прыгоды «Астэрыкс на Алімпійскіх гульнях».

### ТБ3

6.00 М/ф.
8.20, 14.35 «Доктар І...».
8.50, 18.30, 1.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
10.30, 4.20 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
12.15, 17.30 Дак. серыял «Справа Астахава».
13.10, 17.00, 3.05 Дак. серыял «Простыя складанасці».
13.40, 20.20 Серыял «Усё пачалося ў Харбіне».
15.05, 0.00 Серыял «Тайны следства».
16.00, 22.10, 3.30 «Зорныя гісторыі».
21.15, 0.45 Серыял «Загадка для Веры».
23.00 Серыял «Быць чалавекам».

### ТБ1000

5.00, 0.50 Камедыя «У Міні гэта ў першы раз».
6.40 Камедыя «Слава».
8.35 Трагікамедыя «Тост».
10.15 Камедыя «Пастка для нявесты».
11.55 Драма «Мушкецёры».
13.50 Камедыя «Разумнікі».
15.30 Драма «Закаханыя».
17.20 Драма «Што хавае хлусня».
19.00 Драма «Прыгавор».
21.00 Жахі «Экстрасэнс».
23.00 Трылер «Добры доктар».
2.40 Жахі «Франкенштэйн».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

5.20 Камедыя «Пра што гавораць мужчыны».
7.15 Драма «Слон».
9.00 Драма «Апошняя рэпрадукцыя (1)».
11.00 Дэтэктыў «Вяртанне рэзідэнта».
13.30 Фэнтэзі «Рыжак у Залюстаркоўі».
15.40 Камедыя «Аднакласнікі.ru: НаCLICKай удачу».
17.30 Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
19.20 Трагікамедыя «Аддаць канцы».
21.10 Драма «Узломшчык».
22.50 Баявік «Бой з ценем».
1.10 Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
3.50 Камедыя «Не хадзіце, дзеўкі, замуж».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00 Інжынерныя ідэі.
6.00, 12.00 Гульні розуму.
6.30, 12.30 Займальная навука.
7.00 Зрабі або памры.
7.30, 13.00, 19.00 Навуковыя недарэчнасці.
9.00, 14.00, 22.00 Паядынак непераможных.
10.00 Мегазаводы.
11.00 Золата горада-прывіда.
15.00 Астравы.
16.00 Тайнае жыццё драпежнікаў.
17.00 Наземная вайна.
18.00 Аўта-SOS .
20.00, 0.00, 3.00 Золата Юкана.
21.00, 1.00, 4.00 Незвычайныя промыслы.
23.00 Расследаванні авіякатастроф.
2.00 Апакаліпсіс: Другая сусветная вайна.

### DISCOVERY

7.00 Рэальныя дальнабойшчыкі.
7.50 Паляўнічыя на аўтамабілі.
8.40, 13.15, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 13.40, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Ашалелая рыбалка.
10.30, 5.10 Вытворчасць: гонка з часам.
11.25, 16.25 Бітва за нерухомасць.
12.20, 0.55 Top Gear.
14.10, 3.55 Калекцыянеры аўто.
15.05, 18.15, 6.05 Махінатары.
16.00 Пятая перадача.
17.20 Вулічныя гонкі.
19.10 Акулы аўтатаргоў з Даласа.
21.00 Склады: бітва ў Канадзе.
22.00 Гаражнае золата.
23.00 Ліквідатар.
0.00, 3.05 Паляўнічыя на склады.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.

## ЧАЦВЕР, 4 ВЕРАСНЯ

### БЕЛАРУСЬ 1

6.00, 7.20, 8.15 Добрай раніцы, Беларусь!
7.00, 8.00 (з сурдаперакладам), 9.00, 12.00, 15.00, 19.00, 0.05 Навіны.
7.05, 8.05 Дзелавое жыццё.
7.10, 8.10, 19.40, 23.30 Зона Х.
9.10, 21.45 Серыял «След».
11.00, 20.00 Серыял «Земскі доктар. Працяг».
12.10 Дзень у вялікім горадзе.
13.10, 16.35 Серыял «Сямейныя меладрамы».
14.00 Серыял «Фурцава».
15.15, 18.40 Навіны рэгіёна.
15.25 Дэтэктыў «Лета Ваўкоў». 1-я серыя.
17.35 Беларуская часінка.
19.20, 23.50 Сфера інтарэсаў.
21.00 Панарама.
0.25 Дзень спорту.
0.35 Дэтэктыў «Турэцкі гамбіт».

### БЕЛАРУСЬ 2

7.00 Раніца.
9.00, 21.35 Тэлебарометр.
9.05, 16.40 Серыял «Сашка».
10.10 Беларуская кухня.
10.45, 22.50 Дэтэктыў «Кулінар».
11.55 Серыял «Атэль «Вавілон». Заключная серыя.
13.30 «Кіпень».
13.50 Серыял «Універ».
14.55 Серыял «Інтэрны».
16.05 Пад грыфам «Вядомыя».
17.50 Серыял «Сцервы, або Дзівацтвы кахання».
18.55 Футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Таджыкістан.
20.55 Мазгавы штурм.
21.25 КЕНО.
21.40 Серыял «Віртуозы». 1-я серыя.
23.55 Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» — «Дынама» (Мінск).

### БЕЛАРУСЬ 3

7.20 «Дабраранак».
7.50 «Хачу ўсё ведаць!».
8.00, 12.50, 18.45, 21.15, 23.35 «Калейдаскоп».
8.15 «Пунсовыя ветразі». Маст. фільм.
9.35 «Культурныя коды». Дак. фільм.
10.00 «Некалькі дзён з жыцця І.І. Абломава». Маст. фільм.
12.15, 13.30, 15.15, 15.45, 17.25, 18.55 «Размаўляем па-беларуску».
12.20, 23.10 «Святло далёкай зоркі». Памяці паэта-песенніка Адама Русака.
13.00 «Вытокі. Эпімах-Шыпіла». Дак. фільм.
13.35 «Скарбніца Гомельшчыны». Драўляныя святыні палескіх балот.
14.00 Канцэрт Акадэмічнага ансамбля песні і танца Расійскай Арміі імя А.В. Аляксандрава.
15.20 «Наперад у мінулае».
15.50 Серыял «Пракляты ўтульны дом».
16.35 «Містыка ўлады». «Імператарскі асыродак». Дак. фільм.
17.00 «Містыка ўлады». Блазны і каралі». Дак. фільм.
17.30 «Шведская запалка». Кароткаметражны фільм.
18.25 «Пра тое, што памятаю і люблю. Ніна Ургант».
19.00 «Мой ласкавы і пяшчотны звер». Маст. фільм.
20.45 Калыханка.
21.25 «Князь Юрый Даўгарукі». Маст. фільм.

### БЕЛАРУСЬ 5

7.10 Аўтаспорт. Драг-рэйсінг. Этап чэмпіянату Беларусі і Кубка Расіі «burn драг».
8.40 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ. «Атлетык» (Іспанія) — «Наполі» (Італія).
10.35 Футбол. Ліга чэмпіёнаў УЕФА. Плэй-оф. Матч у адказ. «Зеніт» (Расія) — «Стандард» (Бельгія).
12.30 Хакей. Кубак Руслана Салея. Групавы этап.
14.25 Більярд. Чэмпіянат Еўропы.
17.55 Авертайм.
18.25 Хакей. КХЛ. «Ёкерыт» — «Дынама» (Мінск).
20.50 Хакей. Чэмпіянат Беларусі. «Нёман» (Гродна) — «Юнацтва» (Мінск).
22.45 Футбол. Таварыскі матч. Беларусь — Таджыкістан.

### АНТ

6.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00 (з субцітрамі), 20.30 Нашы навіны.
6.05 «Наша раніца».
9.05 «Жыць здорава!».
10.25 «Кантрольная закупка».
11.05, 13.05, 16.10, 18.15, 21.00 Навіны спорту.
11.10 Серыял «Позняе раскаянне».
13.10 «Смак».
13.55 «Модны прыгавор».
15.00 «Сам-насам з усімі».
16.15 «Добры дзень».
16.50 «Давай пажэнімся!».
18.20 Серыял «Зайцаў + 1».
18.50 «Няхай гавораць».
20.00 Час.
21.05 Серыял «Настаўнікі».
23.05 «Першая сусветная».
0.05 Драма «Ундзіна».
1.50 Начныя навіны.

### СТБ

6.00, 7.30, 10.30, 13.30, 16.30, 19.30, 22.30 «24 гадзіны».
6.10, 17.20 «Міншчына».
6.20, 7.45 «Раніца. Студыя добрага настрою».
7.40, 20.10, 22.55 «СТБ-спорт».
9.00, 18.30 «Нам і не снілася»: «Грандыёзны мужчынскі падман».
9.55 Серыял «Чыста па жыцці».
10.40, 17.30 «Званая вячэра».
11.35 «Сямейныя драмы».
12.35 «Не хлусі мне!».
13.50 Маст. фільм «Вам пісьмо».



16.00 «Уявіце сабе».
16.50 «Следакі».
20.00 «Сталічныя падрабязнасці».
20.15 Фантастыка «Вавілон 5: легенда пра рэйнджараў: Жыць і памерці ў ззянні зорак».
22.00 «Глядзець усім!».
23.00 «Тайны свету».
23.55 «Аўтапанарама».
0.15 Серыял «Баец». Заключныя серыі.

### МІР

5.00 «180 хвілін на снеданне».
7.45 «Дыяспары».
8.10, 23.45 Маст. фільм «Дзень сямейнага свята».
9.30 Маст. фільм «Скрыжаванне».
11.15 Дак. серыял «У свеце прыгажосці».
12.00, 15.00, 18.00, 21.00 Навіны (бягучы радок).
12.15 Серыял «Агульная тэрапія».
14.05 Дак. фільм «Тайныя знакі».
15.15, 22.55 Ток-шоу «Слова за слова».
16.05 Серыял «Чэмпіён».
18.20, 2.25 Серыял «Адплата».
21.20 Маст. фільм «Спатканне».
1.15 «Дыяспары».
1.40 Серыял «Рускія страшылкі».

### РТР—БЕЛАРУСЬ

7.00 «Раніца Расіі».
11.00, 14.00, 17.00, 20.00 Весткі.
11.30 «Прамы эфір».
12.55 Серыял «Гаспадыня майго лёсу».
13.50, 16.50, 19.50, 22.40 Навіны — Беларусь.
14.30 Ток-шоу «Пра самае галоўнае».
15.40 «Вяртанне. Эдуард Хіль».
16.40 «Факты».
17.40 Серыял «Пакуль станіца спіць».
19.20 «Навука 2.0».
20.50 Серыял «Пазнай мяне, калі зможаш».
22.50 Маст. фільм «Шчаслівы маршрут».
0.35 «ЗГВ. Горкая дарога дадому».

### НТБ—БЕЛАРУСЬ

6.00 «НТБ раніцай».
8.05 «Да суда».
9.05, 10.20 Серыял «Вяртанне Мухтара».
10.00, 13.00, 16.00, 19.00 Сёння.
11.30, 17.30 Агляд. Надзвычайнае здарэнне.
11.55, 13.20 «Суд прысяжных».
14.30 «Пракурорская праверка».
15.30 «Справа густу».
16.35 Серыял «Масква. Тры вакзалы».
18.00 Ток-шоу «Гаворым і паказваем».
20.05 Серыял «Брат за брата».
22.00 Анатомія дня.
22.55 Серыял «Мянтоўскія войны».
0.35 Серыял «Глухар. Вяртанне».

### 8 КАНАЛ

7.00, 12.40, 19.00, 20.55, 23.50 «Надвор'е».
7.05, 16.05 «Мультпарад».
7.30, 19.05 Серыял «Амерыканцы».
9.35, 17.55 Серыял «Зніклы без вестак».
10.20 «Кінаблакнот».
10.35 «Падарожжа са смакам».
11.00 Драма «Усё самае лепшае».
12.45 Дак. фільм «Чупакабра».
13.40 Серыял «Выкраданыя».
15.15, 23.10 Серыял «Да смерці прыгожая».
16.30 «Тваё здароўе», «Цукровы дыябет».
17.00 Серыял «Дрыжыкі».
18.45 «Тэлемагазін».
20.45 «Вечарніца».
21.00 «Даведнік па краінах і кантынентах».
21.10 Драма «Ахоўнік для дачкі».

### ВТБ

6.00, 1.00 "PLAY".
8.00 М/ф «Смяшарыкі».
8.30, 18.10, 20.30, 0.00 Скетч-шоу «6 кадраў».
9.00, 19.00 Серыял «Дзённік доктара Зайцавай».
10.00 «Лёс без ахвяр».
11.00 Серыял «Свацця».
12.00, 20.00 Серыял «Два бацькі і два сыны».
13.00, 23.30 Скетч-шоу «Даеш моладзь».
14.00 Скетч-шоу «Адна за ўсіх».
15.00 Серыял «Галыгін.ru».
16.00 Фэнтэзі «Брама».
18.30, 0.30 «Лаві момант».
21.10 Драма «Танцы на вуліцах: Нью-Ёрк».

### КУЛЬТУРА

5.30 «Еўраньюс».
9.00, 14.00, 18.00, 22.00 Навіны культуры.
9.20, 22.20 Маст. фільм «Гамлет».
11.35, 15.30, 1.35 «Сусветныя скарбы культуры».
11.50, 17.15 Дак. серыял «Шукаю настаўніка».
12.30 «Расія, любоў мая!». «Традыцыі якутаў».
13.00, 21.00 Дак. фільм «Старажытны Егіпет — жыццё і смерць у Даліне Цароў».
14.10 «Абсалютны слых».
14.50 «90 гадоў Эмілю Верніку. «Белая студыя».
15.50 Шэдэўры рускай музыкі. Выконвае Мікалай Луганскі.
16.40 Дак. фільм «Джордж Байран».
16.50 «Тайна скрыпічнай душы».
18.15 Юбілей Ніны Ургант. «Быць дакладнай».
19.00 «Правілы жыцця».
19.30 «Добрай ночы, малыя!».
19.40 «Культурная рэвалюцыя».
20.25 Дак. серыял «На разломе эпох».
0.30 «Аляксандр Вішнеўскі. Асколак у сэрцы».
0.55 П. Чайкоўскі. Серэнада для струннага аркестра.

### НАСТАЛЬГІЯ

5.00 Дак. фільм «Навошта вы збіраецеся?». 1988 год.
5.40 «Масква — Космас — Каліфорнія». Канцэрт.
6.25 Замежная эстрада.
6.45, 12.40, 0.45 Маст. фільм «Белы шаман».
8.00, 14.00, 20.00, 2.00 «Мінулы час».
9.00, 15.00, 21.00, 3.00 «Народжаныя ў СССР».
10.00, 4.00 «Бенефіс Тацяны Даронінай». Фільм-канцэрт.
11.00 Дак. фільм «Успаміны перад стартам».
12.10 «Дзейныя асобы і...». Фільм-канцэрт.
16.00, 22.00 «Вакол смеху». 1979.
17.00 Дак. фільм «Экспедыцыя ў Гімалаі». 1-я серыя.
18.10 «Куміры. Канцэрт Жэні Белавусава». 1991 год.
18.45 Маст. фільм «Інспектар Гул». 1-я серыя.
23.00 «... Да 16 і старэйшым». 1991 год.
23.50 «А я іду...». Фільм-канцэрт.
0.15 Дак. фільм «Вячэрні альбом. Лірычны лікбез».

### EUROSPORT

4.00, 11.30, 15.00, 18.45, 22.05, 2.05 Тэніс. Турнір Вялікага Шлема. Адкрыты турнір ЗША.
9.30, 16.00 Веласпорт. Нацыянальны тур Іспаніі.
10.30 WATTS.
14.00 Конны спорт. Сусветныя конныя гульні.
22.00, 2.00 Тэніс. Гейм, сэт і Матс.

### КАМЕДЫЯ

5.00, 9.00, 2.10 Серыял «Месяцовы хлопчык».
5.50 Камедыя «Баскетбольная ліхаманка».
7.25 Камедыя «Увесь я».
9.55 Камедыя «Як разабрацца са справамі».
11.45 Камедыя «Няўдачлівыя».
13.30, 16.30, 21.00 Серыял «Сваты».
14.50 Камедыя «Вяселле Бэтсі».
17.45 Фэнтэзі «Прывід з шафёрам».
19.20 Камедыя «Лэдзі кажа «не».
20.45, 23.50 Скетчком «Паміж намі».
22.10 Камедыя «Лары Краўн».
0.15 Камедыя «Мужчыны ў вялікім горадзе».
3.00 Камедыя «Прынц і танцоўшчыца».

### ТБ3

6.00 М/ф.
8.20, 14.35 «Доктар І...».
8.50, 18.30, 1.30 Серыял «Цудоўнае стагоддзе».
10.30, 4.20 Дак. серыял «Па справах няпоўнагадовых».
12.15, 17.30 Дак. серыял «Справа Астахава».
13.10, 17.00, 3.05 Дак. серыял «Простыя складанасці».
13.40, 20.15 Серыял «Усё пачалося ў Харбіне».
15.05, 0.00 Серыял «Тайны следства».
16.00, 22.05, 3.30 «Зорныя гісторыі».
21.10, 0.45 Серыял «Загадка для Веры».
23.00 Серыял «Быць чалавекам».

### ТБ1000

5.00 Камедыя «Разумнікі».
7.00 Меладрама «Трыстан і Ізольда».
9.20 Жахі «Франкенштэйн».
11.40 Камедыя «У Міні гэта ў першы раз».
13.20 Меладрама «Спяшайся кахаць».
15.20 Жахі «Экстрасэнс».
17.20 Трылер «Сачэнне».
19.00 Камедыя «Амаль знакаміты».
21.10 Камедыя «СМСуальнасць».
22.50 Драма «Прыгавор».
0.50 Драма «Парфумер: Гісторыя аднаго забойцы».
3.20 Трылер «Тормаз».

### ТБ1000 РУСКАЕ КІНО

5.20 Камедыя «Пра што яшчэ гавораць мужчыны».
7.15 Камедыя «На здрадзе».
8.50 Драма «Апошняя рэпрадукцыя (2)».
10.45 Дэтэктыў «Канец аперацыі «Рэзідэнт».
13.30 Фэнтэзі «Казка. Ёсць».
15.10 Камедыя «Скарбы О.К».
17.10 Драма «Гарпастум».
19.20 Драма «Гагарын: Першы ў космасе».
21.20 Камедыя «Дазвольце цябе пацалаваць... на вяселлі».
23.00 Баявік «Бой з ценем: Рэванш».
1.20 Камедыя «Дублёр».
2.50 Дэтэктыў «Памылка рэзідэнта».

### NATIONAL GEOGRAPHIC

5.00, 10.00 Інжынерныя ідэі.
6.00, 12.00 Гульні розуму.
6.30, 12.30 Займальная навука.
7.00 Зрабі або памры.
7.30 Навуковыя недарэчнасці.
8.00, 13.00 Золата Юкана.
9.00, 14.00 Незвычайныя промыслы.
11.00 Золата горада-прывіда.
15.00 Замбезі.
16.00 Тайнае жыццё драпежнікаў.
17.00, 2.00 Наземная вайна.
18.00 Аўта-SOS.
19.00 Паядынак непераможных.
20.00, 0.00, 3.00 Сіла племені.
21.00, 1.00, 4.00 Экстрэмальнае падарожжа.
22.00 Экстрэмальныя даследчыкі.
23.00 Ліхтугі за мяжой.

### DISCOVERY

7.00 Ашалелая рыбалка.
7.50 Калекцыянеры аўто.
8.40, 13.15, 20.35 Як гэта ўстроена?
9.10, 13.40, 20.05, 4.45 Як гэта зроблена?
9.35 Чыгунка Аляскі.
10.30, 5.10 Скрозь кратовую нару.
11.25, 16.25 Паляўнічыя на склады.
12.20, 0.55 Top Gear.
14.10, 3.55 Новае жыццё хотродаў.
15.05, 6.05 Махінатары.
16.00 Пятая перадача.
17.20, 0.00, 3.05 Ліквідатар.
18.15 Гаражнае золата.
19.10 Склады: бітва ў Канадзе.
21.00 Смяротны ўлоў.
22.00 Сібірская рулетка.
23.00 Дзённікі вялікай вайны.
1.50 Сапраўдныя аферысты.
2.40 Маланкавыя катастрофы.



■ Зроблена з душой

# ЦУД ГЛЫБОЦКАЙ ПАДКОВЫ

**Карэспандэнт «Звязды» пагутарыў з кавалём, пра якога нават фільмы здымаюць**

**Каваль з Глыбокага Дзяніс Дубіна — адзіны класічны майстар сваёй справы на ўсю акругу. Яго кузня сёння, у прынцыпе, нічым не адрозніваецца ад тых, якія былі ў старадаўнія часы на Беларусі. Сакрэты майстэрства Дзяніс пераняў ад свайго бацькі — славутага майстра Аляксандра Сяргеевіча Дубіны, які быў віцэ-прэзідэнтам Саюза кавалёў СССР, узнагароджаны знакам ВЦСПС «За дасягненні ў самадзейным мастацтве», лаўрэатам другога Усесаюзнага фестывалю народнай творчасці...**



## ПАМЯЦЬ У МЕТАЛЕ

Журналісцкая ўдача звяла мяне з Дзянісам Дубінам у цэнтры Глыбокага, дзе на гарадскім свяце працаваў «Горад майстроў». Многім хацелася купіць на памяць падкову з надпісам, які рабілі на іх вачах, а таксама манету. Самыя рашучыя прасілі даць ім невялічкі майстар-клас і працавалі разам з кавалём.

— Я — каваль, як і мой бацька. Мы — тутэйшыя: бацька родам з вёскі Запруддзе Глыбоцкага раёна, я ў райцэнтры жыву. Канешне, яшчэ ў дзяцінстве мне было цікава назіраць за тым, як працаваў бацька. Кузня ж была побач з домам. Калі крыху падвучыўся, сяброў вадзіў туды і настаўнікам у іх быў, — расказвае Дзяніс.

Бацька яго спачатку закончыў Віцебскі політэхнічны тэхнікум, а потым навучаўся ў тэатральна-мастацкім інстытуце на аддзяленні па мастацкай апрацоўцы металу. Працаваў майстрам на кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Мог, вядома, застацца ў вялікім горадзе. Але ў 1975 годзе вярнуўся на малую радзіму. Гадоў дванаццаць працаваў на Глыбоцкім малочнакансервавым заводзе мастаком-афарміцелем.

— Пры заводзе была кузня. Бацька, каб стаць сапраўдным майстрам, хадзіў па вёсках, знаёміўся з дзядулямі, якія калісьці працавалі кавалямі. На жаль, кавальская справа на той час была амаль што згублена. Кавалёў мала засталося, кузні закінулі. Ды і зараз... Атрымалася так, што бацька пачаў адраджаць гэтае рамяство. Інструменты нікому не патрэбныя збіраў, аднадумцаў шукаў.

У гады перабудовы якраз дазволілі рэгістраваць кааператывы. І бацька ў 1988 годзе зарэгістраваў такі — «Дэкор» — па мастацкай коўцы і разьбе па дрэве. З дрэвам, пагадзіцеся, метал добра спалучаецца. Запрасіў некалькі чалавек з завода: зваршчыкаў, токараў, слесараў. Бацька дом будаваў і каля яго арганізавалі кузню. Працавалі і ў арэндаваным будынку, які потым выкупілі. Займаліся афармленнем дамоў культуры, бібліятэк, касцёлаў, праваслаўных храмаў.

У прамяць аб бацьку, якога, на жаль, не стала 11 гадоў таму, Дубіна-малодшы зрабіў помнік. Каваль у метале — добрая памяць пра чалавека з «залатымі рукамі».

## ЗАРАБЛЯЛІ ПА 500 САВЕЦКІХ РУБЛЁЎ

Кааператыў дзейнічаў паспяхова. Калі ў той час зарплата ў 300 рублёў лічылася вельмі добрай, кавалі і рэзчыкі па дрэве ў кааператыве зараблялі па 500-600 рублёў штомесяц.

— Грымелі на ўсю краіну. Адкуль толькі да нас не прыязджалі! Сярод знакамітых гасцей быў, напрыклад, польскі касманаўт.




Па ініцыятыве бацькі ў ліпені 1990 года ў Глыбокім праводзілася Беларускае свята кавальскага майстэрства памяці паэта-каваля Паўлюка Багрыма. Падобнае свята адбылося і налета. А многія ж лічаць, што першы кавальскі фэст адбыўся ў Дудутках і на міжнародным фестывалі мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску». Не, у нас! Тады ж і «базару» наогул не было.

У сярэдзіне 1990-х бацька стаў вольным мастаком, індывідуальным прадпрымальнікам. Мне пашчасціла працаваць з ім.

Аднойчы прыехаў да нас малады ксёндз і прызнаўся, што сам хацеў бы стаць кавалём, нават кузню стварыў бы... Папрасіў зрабіць вароты незвычайныя: на першы погляд, быццам бы простыя, але каб вузлы адмысловыя каваныя былі. Мы доўга рабілі — месяцы тры, калі не памыляюся. Акрамя варотаў, яшчэ і брамкі зрабілі, — успамінае каваль. Што тычыцца ўнікальных заказаў, то кожны, калі размова ідзе пра мастацкі выраб, пасвойму непаўторны.

Мне не сорамна за свае працы. Кожную рабіў ад душы. Мне часам кажуць: чаму, маўляў, пальчаткі не надзяваеш і без спецыяльных акуляраў працуеш? Я павінен тое, што раблю, адчуць рукамі і ўбачыць, каб нічога не перашкаджала. Працую па-старому. Фільмы сюды прыязджаюць здымаць пра старадаўнія беларускія гарады і пра маю кузню. Драўляная ў мяне кузня — звычайная, горан і кавадла, усё, як некалькі стагоддзяў таму.

Дарэчы, у сярэдзіне 1990-ых гадоў студыяй «Беларусьфільм» быў зняты дакументальны фільм пра глыбоцкіх майстроў (у тым ліку і пра бацьку Дзяніса) «Меч і ружа».

— Часцей за ўсё да мяне прыходзяць і просяць адрамантаваць сельскагаспадарчы інвентар — напрыклад, плуг. Людзі кажуць, што я, аказваецца, адзін каваль на ўвесь раён. Калі зубіла нейкае паправіць, таксама да мяне. Падкову для каня зрабіць? Калі ласка. А ў вольны час — мне гэта вельмі падабаецца — мячы раблю. Так, вывучаю гісторыю, збіраю халодную зброю: нажы, мячы. Бывае, убачу нешта цікавае і аналагічнае раблю — мне гэта сапраўды даспадобы, — прызнаўся Дзяніс Дубіна.

Аднойчы падчас міжнароднага фестывалю мастацтваў да яго ў «Горадзе майстроў» падышлі хлопец і яго цяжарная спадарожніца.

Хлопец папрасіў прадаць падкову. А каваль падарыў яе жанчыне.

— Прыкладна гадоў праз дзесяць сустрэліся зноў на фестывалі. Той хлопец сказаў: «Я стаў кавалём! Не паверыш, калі ты маёй жонцы падарыў падкову, я задумаўся: можа, і мне паспрабаваць заняцца кавальскай справай? Працаўладкаваўся на фірму, дзе робяць вырабы з металу, і вырашыў стаць кавалём». А калі мы пазнаёміліся, здаецца, яшчэ не былі жанатыя. Ажаніліся! Можна сказаць, з маёй падачы, — здзівіў сваім расказам суразмоўца.

У самога Дзяніса Дубіны два сыны: старэйшаму 10 гадоў, малодшаму хутка споўніцца год. Будзе каму працягнуць кавальскую справу! А ў Глыбоцкім музеі можна ўбачыць насамрэч цудоўныя творы яго бацькі, фотаздымкі...

**Аляксандр ПУКШАНСКІ,**
*Глыбокае — Віцебск*



■ Нефармат

# ФОРМА І ЗМЕСТ

**Еду сёння раніцай на працу ў маленькім аўтобусе 23-га маршрута як той селядзец у бляшанцы. Гэты «ПАЗік» заўсёды біткам набіты, бо малы. Яго пусцілі ў фактычна новы квартал на былой пустцы, які склаўся з сацыяльных дамоў на вуліцы Суворава. У гэтым вузкім цесным аўтобусе сёння амаль усе сядзячыя месцы занятыя мужчынамі — як на падбор, гадоў да сарака. Жанчыны над імі літаральна вісяць, бо стаяць цесна. Мужчыны, хоць і сядзяць, падаюцца панурымі, глядзяць уніз на свае калені. Маладыя, але нейкія заклапочаныя, нібы груз на плечы ім цісне. Потым прыходзіць думка: яны ж, відаць, шматдзетныя бацькі, едуць з сацыяльных дамоў, месцы занялі, бо садзіліся першымі амаль на канцавым прыпынку. А галовы апускаюць, бо глядзець няёмка, як жанчыны, нават нашмат старэйшыя, літаральна звісаюць над імі. І становіцца таксама няёмка за іх аж да шкадавання...**

Такое ж адчуванне было, калі ў спёку даводзілася сустракаць мужчын у шортах, падобных на спартыўныя трусы, і шлёпанцах у розных установах. У такім выглядзе многія прыходзілі, напрыклад, на прыём да ўрача. Адзін нават заявіўся на бацькоўскі сход у школу. Наша класная кіраўніца ад здзіўлення аж вочы шырока расплюшчыла. А што тут скажаш? Грошы на рамонт класа ён здае рэгулярна. Праўда, афіцыйна нідзе не працуе. Машыны з Польшчы ганяе. Але заўсёды самаўпэўнены, самазадаволены, адчувае сябе гаспадаром жыцця. Што выглядае недарэчна ў такім «прыкідзе» на бацькоўскім сходзе, ён жа не здагадваецца. Як і той у паліклініцы. Зноў няёмка за яго, хоць, можа, і чалавек ён нядрэнны.

Скажаце, толькі за мужчын сорамна? Не. Ужо, здавалася б, праходзіць мода на адзенне з голымі пупкамі. Але ўсё роўна знаходзяцца ярыя прыхільніцы. Вось і не так даўно ў тралейбусе бачыла такую дзяўчыну ў стыльных джынсах і кароценькай куртачцы. Фігурка, макіяж, прычоска гаварылі пра тое, што ўладальніца не пазбаўлена густу. І ўсё было б амаль добра, каб не вялікі шрам ад аперацыі, край якога выглядваў з джынсаў і змазваў усё ўражанне ад моднага прыкіду разам з «падкрэсленай індывідуальнасцю». Станавілася неяк нават жаласліва-няёмка, так і хацелася падказаць, параіць, што кароткая куртачка ў яе выпадку неяк не да месца. Але было відавочна, што яна наўрад ці прыслухаецца да чужога меркавання. Як, напэўна, не прыслухаюцца і прыгажуні, якіх можна назваць не стройнымі, а пышнацелымі. Таму, здараецца, ад карціны, што раптоўна ўзнікае перад вачыма, аж дух захоплівае. Уявіце сабе: дама без комплексаў ад 20 да 40, у якой лішнія кілаграмы выглядаюць, ледзь не вывальваюцца і завісаюць над джынсамі. Джынсы пры гэтым павінны шчыльна аблягаць ногі і ўсё, што з імі арганічна звязана. Яны і аблягаюць. І ад гэтага робіцца яшчэ больш ніякавата. Цяпер жа безліч варыянтаў адзення. Можна прыдбаць шырокую туніку альбо блузу «а-ля ранняя Ала Пугачова» і ўдала схаваць лішняе. Чамусьці многія паненкі ды і кабеты да гэтага не могуць дацяміць. Ім і так добра, у кампаніі з мужчынамі, тымі, што ў трусах і шлёпанцах, хадзіць па вуліцы, наведваць крамы ды розныя ўстановы. Таму расказваць ім пра адпаведнасць зместу і формы — гэта марнаванне часу.

Хоць дзеля справядлівасці трэба адзначыць, што не заўсёды гэтая адпаведнасць, так бы мовіць, спрацоўвае. На ўсё жыццё, відаць, запомнілі дзве турысткі з Беларусі грозную на выгляд прадаўшчыцу з гастранома «Добры» ў Пяцігорску. Ішоў 1990 год. Мы з сяброўкай у складзе групы адпачывалі на Паўночным Каўказе. Нехта нешта пераблытаў у турагенцтве, і аказалася, што білеты дадому заказаны толькі на наступны дзень. Гэта азначала, што суткі мы павінны кантавацца ў чужым горадзе, неяк харчавацца. Начлег для нас кіраўнік групы з цяжкасцю знайшоў. З ежай было горш. Магазіны былі як танцпляцоўкі — зусім пустыя. У мяне настрой быў прыўзняты, бо даўно марыла наведаць музей Лермантава, а тут падарунак лёсу, з-за якога можна было і пагаладаць. А вось сяброўка вельмі засумавала. Першы і апошні раз мы каштавалі марозіва, прыгатаванае... з вады, — ну, можа, якая лыжка цукру на вядро дабаўлена. Агледзеўшы славутасці, звязаныя з іменем вялікага паэта, мы няспешна хадзілі па вуліцах горада ў надзеі купіць хоць нешта на дарогу. Ва ўніверсам пад назвай «Добры» зайшлі амаль без усялякай надзеі і вачам не паверылі: на паліцах — розныя прадукты, каўбаса, а пакупнікоў няма. Вопытным позіркам угадаўшы прыезджых, мажная і грозная, як атамны ледакол «Ленін», прадаўшчыца толькі павярнула галаву да нас і сказала: «Магазін абслугоўвае ветэранаў». Я ўжо намерылася развярнуцца і хутка пайсці, а сяброўка, як зачараваная, глядзела на паліцу. Варта заўважыць, што ў Лены асаблівая канстытуцыя, і выглядае яна вельмі худой. А калі дадаць кругі пад вачыма ад стомы ды нявыказаную роспач ва ўсёй постаці... Словам, гэтая вялікая, як здавалася, непрыступная жанчына моўчкі ўзяла батон каўбасы, адрэзала ладны кавалак, узважыла і падала ёй: «На, а то павалішся хутка». Мы тую каўбасу і цяпер успамінаем. А вы кажаце: змест адпавядае форме...

**Святлана ЯСКЕВІЧ**



■ Простыя рэчы

# Шаршатка

**Шаршатка — самая знакамітая з іголак. Улюбёная «народная каралева», першародная, якая ніколі не была прынцэсай. Змор採 пранізлівым холадам і ў выніку азораны прасвятленнем розуму, пра-пра... прапродак цяперашняга чалавека прыкладна 20 тысяч гадоў таму адразу вынайшаў якраз шаршатку, а не якую-небудзь іголачку-малюпашку, якой толькі і можна што вышываць дробненькім бісерам зamілавальныя для вачэй малюнкі. Трэба ж было сшыць жывёльнымі жыламі целагрэйныя шкуры, каб абкруціцца імі, не сканаць ад ледніковай сцюжы — дык вось вам і шаршатка, з ашчэпка якой жывёльнай косткі ці суцэльнай косткі рыбіны...**



НАТУРАЛЬНА, што той далёкі-далёкі прашчур не ўсведамляў сябе беларусам, і зусім не таму, што жыў недзе на тэрыторыі цяперашняй Францыі або Швейцарыі. На той час яму дастаткова было толькі адрозніць сябе ад звяроў... А каб быў вынаходца беларусам, дык абавязкова ўчуў бы, як вялізная іголка з шаргаценнем прасоўваецца праз шкуру. Апошняе намаганне — і яна прарываецца разам з уцягнутай у шчылінку-вушка стоненай жылай: «Шарша-т-ка...» «Т-ка» — нібы корак з мікстуравай бутэлечкі адным рухам выцягнулі.

Згубіўшы шаршатку ў стозе сена, як ні круці, а маеш усё ж трошкі большую надзею знайсці яе, чым маленькую іголку. Але гэта я сказаў так, дзеля забаўкі.

Для мяне вельмі прывабнае тое, што «народная каралева» надзвычай літасцівая да сваіх састарэлых падданых.

Бывала, папросіць бабуля:

— Унучак, уцягні ў іголку нітку: колькі ні ўзіраюся, аніяк не магу вушка ўбачыць...

Тут жа падхопліваешся, спяшаешся хутчэй услужыць любай бабусі. Раз, два — і гатова. Прыемна, радасна, што дапамог, нібы якую вялікую справу зрабіў. Да таго ж міжволі ўсвядоміў, як табе яшчэ далёка да старасці — нібы да неба.

Але ніколі не прасіла мяне бабця ўцягнуць нітку ў шаршатку, сама спраўлялася: у шаршаткі ж куды большае вушка. Да таго ж задубелым на сіверы, звыклым курчыцца на цаўях грабель ды вілаў, на дзяржальнях сярпоў пальцам вясковых жанчын куды лацвей было падчас шыцця ўпраўляцца вялікай іголкай.

Няхай сабе шаршаткай не вельмі спрытна цыраваць тонкія шкарпэткі і панчохі, затое ёю зручна лапіць вопратку, асабліва з грубай тканіны, мужавы ватныя штаны ды фуфайкі. Іголачкай іх не абладзіш. А лапіць жа ў гады майго маленства даводзілася вельмі шмат: што і казаць, сялянская вопратка пры штодзённым завіханні на таку, пад шахой, у лесе, хляве хутка зношвалася, праціралася. А дзе ты на працадні што купіш? Ды і на мізэрную хрушчоўскую зарплату не разгонішся...

МАМА, помню, дужа шмат лапіла — бацька ж, такі ў яго быў характар, шчыраваў на калгасным полі, не раўнуючы як на сваім. Дык шаршатка зноў і зноў выцягвалася з клубка моцных нітак. Лапікі мама рабіла спешна, накладныя, бывала, і з тканіны іншага колеру, бо толькі дурань імкнецца прытаіць ад людзей сваю беднату — саромеецца, як кавалер перад дзеўкамі.

А яшчэ мама ў маладыя гады прызвычаілася нават і вышываць шаршаткай. Не на пяльцах, вядома, а па тоўстым, шчыльным, пафарбаваным у чорны колер кужалі — наш беларускі арнаментальны ўзор, даволі вялікімі крыжыкамі, натуральна, каляровымі ніткамі... Атрымалася даволі прыгожая капа, якой доўгія гады маці засцілала адзін з ложкаў. Зберагаю гэты покрыў як прыемную згадку і па сёння...



Аднойчы, калі матуля на самоце жыла яшчэ ў вёсцы, прыехаў да яе ў выхадныя пагасціць-праведаць. Падаставаў з заплечніка харчы-пачастункі, а потым з другога засека — лёгкую хатнюю вопратку ды тэпці. Пераапрануўся, усунуў ногі ў мяккі абутак — авохці, з аднаго тэпця вялікі палец вытыркаецца. І не заўважыў, калі працерлася тканіна. «Прыеду ў горад, новыя куплю. Бяды такой...» — падумаў я і неўзабаве пачаў збірацца на рыбалку — балазе ботам маім зносу няма.

Калі мы з сябрам вярнуліся з возера, я зноў утачыў ногі ў свае старэнькія тэпці і зноў здзівіўся: дзіркі не было! «Відаць, угледзела мая клапатлівая...»

— Мама, ты тэпаць зацыравала? — спытаўся, каб падзячыць.

— А няго ж...

Натуральна, што пасля такой матчынай увагі я аніяк не мог выкінуць на сметнік стары абутак і яшчэ доўга хадзіў у цёплых тэпцях па сваёй роднай хаце.

Калі зусім састарэлую маці я забраў да сябе ў горад, дык аднойчы (балазе патрапілася на вочы) купіў ёй новенькую шаршатку. Не старога ўзору, трохі інакшую, больш доўгую, не такую спрытную, як ранейшыя, можа, адмысловую, для падшывання валёнак ці што... Другой не было. Але гэта мяне не засмуціла: усё адно ўжо знямоглая ад старасці мама не магла ды і не мела патрэбы што-небудзь шыць-цыраваць. Мне хацелася, каб яна проста патрымала яе ў руках — як згадку аб сваіх маладых гадочках, ды ўторкнула ў які клубок як усё яшчэ неабходную, незаменную ў жыцці рэч.

УСЕ мы, каб вы ведалі, сваёй парой тулімся не ў адной матчынай абалонцы, а ў дзвюх, толькі пачаргова. Спачатку — ва ўлонні, і потым штогод святкуем дзень выхаду з яго — нарадзіліся, дзякаваць Богу, пабачылі белы свет! А далей — ідзём пад матчыным покрывам, сатканым з малітваў, перасцярог, наказаў, ушчуванняў, просьбаў, зноў малітваў, шапатлівых настаўляльных закідаў, павучэнняў, зноў малітваў, малітваў...

А калі гэты покрыў спадае долу, на сыпучы грудок — жывы, небарака, пад голым небам. Нікому не дадзена ўзняць яго, атуляльны матчын покрыў, узвысіць хаця б да аблокаў, расхінуць хаця б да ніткі далягляду. І аніяк не падлезці пад яго ніцма, нават самай маленькай казюркай. Хіба толькі апалае лісце зграбеш грабелькамі... О, як потым пашкадуеш, што болей ніхто на свеце не дарue табе вялікую ці малую правіну (усе яны, да адной, куды меншыя, чым матуліна сэрца) так, як умее даравацць яна. Ніхто, нават Бог. А калі і даруюць, дык усё адно не асветляць сваім дараваннем душу, а то і засмуцяць цябе, зніякавелага. Лічы, сіротка, дні жалобы... Над табой толькі покрыў Божай — усіхнай, а не тваёй — маці. Ты абагулены, і памножаны, але цябе паменела на гэтым свеце.

Іншым разам я думаю: а покрыў сваіх матулечак, няхай сабе і не з такіх трапна-дасяжных малітваў, не з такога наўпраставага звяртання менавіта да Збавіцеля, людзі адчувалі над сабой і да нараджэння Ісуса. Можа, гэта якраз той выпадак, калі чалавечая існасць амаль што роўная Божай і, не пабаюся сказаць, з'яўляецца першаіснай, а покрыў Багародзіцы, нібы разнакаляровая коўдра, сшыты ў тым ліку і з покрываў нашых матуль...

РАНІЦАЙ, калі прачнецца, памыецца маці, я штораз зазіраю ў яе пакой і пытаюся:

— Мама, ты памалілася? Сняданак гатовы...

Напрыканцы сваіх малітовачак, звяртаючыся з просьбамі да Бога, маці вышэптвае маё імя ды імёны сваіх унучак, праўнучак, зусім яшчэ маленькага праўнука, іншых родных і блізкіх. Нягледзячы на тое, што з кожным годам шэпт маёй старэнькай робіцца цішэйшым і цішэйшым, яе покрыў нада мной, як я адчуваю, па-ранейшаму ахоўна-шчыльны. І калі я, нябога, трохі схіблю ў жыцці, збочу з бойнай, натаптанай продкамі дарогі, спатыкнуся і такім чынам прарэджу ў якім месцы або, яшчэ горш, прадзіраўлю матулін покрыў, дык яна, даражэнькая, тут жа зацыроўвае яго шаршаткай сваёй пранікнёнасці з уцягнутай у яе ніткай самай песняслоўнай малітвы. А калі незнарок, з паспешлівасці ўколе ёю Бога, дык няхай Ён не надта сярдуе: мая гаротніца-матуля з душой, да галавешкі абпаленай вайной, працятай незагойнай ранай страты адзінай, памерлай ад цяжкай хваробы дачушкі, мае права на такую неабачлівасць...

**Сяргей РУБЛЕЎСКІ**

■ СпаДАРОЖНІК

# БУДОЎЛЯ МЕТРО «ЗАКРЫЛА» РУХ

**У сувязі з будаўніцтвам трэцяй лініі метрапалітэна ў сталіцы на доўгі час закрываецца рух усіх відаў транспарту па вуліцы Жукоўскага ад вуліцы Варанянскага да вуліцы Аэрадромнай. Арыенціровачна такое становішча будзе захоўвацца да верасня наступнага года.**

Адначасова, як інфармуе дзяржаўнае прадпрыемства «Мінсктранс», з 30 жніўня будуць унесены змяненні ў работу пасажырскага транспарту. У прыватнасці, рух аўтобусаў маршрута №4 «ДС «Дружная» — «Ст. «Мінск-Паўднёвы» арганізуецца па вуліцах Талстога, Маскоўскай, Чкалава, Аэрадромнай, 2-м Германаўскім завулку, Фізкультурным завулку ў абодвух напрамках. Аўтобусы маршрута №10 «ДС «Дружная» — Варанянскага» пойдуць па вуліцах Талстога, Маскоўскай, Чкалава, Варанянскага ў абодвух напрамках.

## На Сімферопаль адпраўленне ў той жа час

**Беларуская чыгунка з 17 верасня прадоўжыць продаж білетаў на цягнік Мінск — Сімферопаль, паведамілі ў яе прэс-службе.**

З завяршэннем летняга сезона змяняецца перыядычнасць курсіравання цягніка № 100/99 Мінск — Сімферопаль: ён будзе адпраўляцца з нашай сталіцы з 17 верасня па няцотных чыслах, а з Сімферопаля з 18 верасня — па цотных.

Час адпраўлення і прыбыцця цягніка застаецца без змяненняў. Са станцыі Мінск-Пасажырскі ён будзе выходзіць у 7.45 і прыбываць на станцыю Сімферопаль-Пасажырскі ў 13.05 наступнага дня. У зваротным напрамку састаў адпраўляецца з Сімферопаля ў 19.20, прыбывае ў Мінск у 23.17 наступнага дня.

# З ВЕРАСНЯ ТРАНСПАРТУ СТАНЕ БОЛЬШ

**У сувязі з традыцыйным павелічэннем пасажырапатоку ў асенне-зімовы перыяд у верасні запланавана паэтапнае павелічэнне колькасці рухомага саставу на маршрутах гарадскога пасажырскага транспарту ў час пік.**

Як паведамілі ў дзяржаўным прадпрыемстве «Мінсктранс», з 1 верасня стане больш рухомага саставу на 19 аўтобусных маршрутах (напрыклад, такіх, як №№2С, 5Т, 32С, 42, 43Д, 45 і інш.), 17 тралейбусных маршрутах (сярод якіх №№3Д, 6, 8, 10, 17) і 5 трамвайных (№№3-6, 11). З 15 верасня — яшчэ на 16 аўтобусных (№№1, 15, 20С, 35С і інш.), 12 тралейбусных (№№26, 27, 29, 31 і г.д.) і 3 трамвайных (№№1, 7, 9).

Таксама на зімовы перыяд аднаўляецца праца наступных маршрутаў гарадскога пасажырскага транспарту: з 1 верасня — аўтобусных №№185С, 188С, 189, 196, 196Д; з 15 верасня — тралейбуснага маршрута №41.

## Рэвізоры прадоўжаць праверку цягнікоў



**Беларуская чыгунка прадоўжыць да 1 верасня мерапрыемствы суцэльнага кантролю за безбілетным праездам у цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа. На гэты раз яны пройдуць на Мінскім чыгуначным вузле.**

Нагадаем, што нядаўна з мэтай узмацнення барацьбы з безбілетным праездам Беларуская чыгунка правяла дэкаду суцэльнага кантролю ў цягніках рэгіянальных ліній эканом-класа на ўсіх аддзяленнях. Прэс-служба распавяла, як праходзіў учора такі кантроль на станцыі Мінск-Паўднёвы: раніцай на працягу гадзіны кантралёры-рэвізоры, супрацоўнікі ваенізаванай аховы і работнікі Мінскага аддзялення дарогі правяралі цягнікі рэгіянальных ліній эканом-класа, якія ішлі па маршрутах Асіповічы — Мінск-Пасажырскі і Пухавічы — Мінск-Пасажырскі. Працягласць працэдуры дагляду кожнага цягніка складала 5-6 хвілін. Перад прыпынкам па сетцы ўнутрысалоннага апавяшчэння пасажыраў інфармавалі аб парадку праверкі. На станцыі Мінск-Пасажырскі была прадугледжана выдача даведак аб спазненні цягнікоў, у дачыненні да якіх праводзіўся суцэльны кантроль. Вынік праверак наступны: прыкладна за гадзіну выяўлена 17 пасажыраў, якія ехалі без праязных дакументаў.

**Сяргей РАСОЛЬКА**

